

НОВАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ «ШЛЯХЦІЦА ЗАВАЛЬНІ» 9

ЧЭМПІЁНКА ЕЎРАГУЛЬНЯЎ — ПРА ПЕРАМОГІ І СЛЁЗЫ 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родны мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІПЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 130 (28997)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАНЮК, Генеральны пракурор:**

*«Адных прававых мер у барацьбе з п'янствам за рулём недастаткова. Трэба думаць пра нейкія дадатковыя меры. Пытанне можа быць вынесена на грамадскае абмеркаванне, і СМІ павінны далучыцца да гэтага. Пазіцыя Прэзідэнта па пытанні барацьбы з п'янствам за рулём вельмі жорсткая. Гучала, у прыватнасці, прапанова аб пажыццёвым пазбаўленні правоў нецвярозых кіроўцаў. Не выключаю, што з часам у Беларусі да гэтага прыйдуць. Але нават такіх мер недастаткова — пазбаўленыя правоў усё роўна садзяцца за руль, тыя, у каго канфіскавалі аўто, — бяруць на час чужыя машыны, ганяюць на іх. Меры з пункту гледжання закону трэба прымаць абавязкова, але ёсць неабходнасць і яшчэ нейкія іншыя захады прапрацоўваць».*

«Славянскі базар у Віцебску — 2019»

# СВЯТА ДРУЖБЫ І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**11 ліпеня афіцыйна ўзяў старт XXVIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У амаль трохгадзінным гала-канцэрце ўрачыстага адкрыцця мастацкага форуму прагучалі тэмы любові да малой радзімы, славянскай дружбы, сямейных, агульначалавечых каштоўнасцяў і пераемнасці пакаленняў.** СТАР. 2, 12



Фота БелТА.




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## КОРАТКА

- **У Нясвіжы плануюць рэканструяваць касцёл Божага Цела.**
- У Беларусі за суткі знайшлі трох чалавек, якія заблудзіліся ў лясах.
- **Мінфін Беларусі 16 ліпеня правядзе продаж новага выпуску валютных дзяржаблігацый.**
- Больш за 20 спарткомплексаў у Мінску будуць працаваць бясплатна 27 ліпеня.
- **Папраўкі ў законы аб дзейнасці партый і аб'яднанняў вынесены на грамадскае абмеркаванне.**
- Тэмпература паветра ў Беларусі ў першай дэкадзе ліпеня была на 2—6 градусаў ніжэйшая за норму.
- **Больш за 90 школьнікаў з Кітая адпачнуць і аздаравяцца ў «Зубраняці» ў ліпені.**

ISSN 1990 - 763X

Чысты свет

# ЯК ЭКСКУРСІЯ ЗМЯНІЛА СВЕТАПОГЛЯД

## Пабачыць 32 гектары адходаў, каб адмовіцца ад лішніх пакетаў

**Такую мэту паставілі перад сабой актывісты сацыяльнай кампаніі «Пакед, пакет!». Яны спадзяюцца, што мінчане, якія трапілі на палігон «Трасцянецкі» і смеццеперапрацоўчы завод побач з ім, цяпер тройчы падумаюць, перш чым пакаваць два апельсіны ды тры агуркі ў асобныя пакеты. Праблема празмернага выкарыстання ўпакоўкі павялічваецца тэмпамі, угнацца за якімі амаль немагчыма. Штогод сталіца прадукуе 2 тысячы тон пластыкавых пакетаў (1 мільярд штук), якія выкідваюцца часцей за ўсё пасля першага ж выкарыстання. Па прагнозах экспертаў, магчымасцяў палігона пад мікрараёнам Сосны хопіць яшчэ гады на тры. А што далей?..**

### ЦІ ЗМЕНЯЦЦА СПАЖЫВЕЦКІЯ ЗВЫЧКІ?

Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў і рух за перапрацоўку адходаў «Мэта 99» далі людзям магчымасць на свае вочы пабачыць, як выглядаюць «смеццевыя могілкі», і задумацца, ці варта адгукацца на прапанову на касе пра «бясплатны» пакет. Ідэя заканадаўча абмяжоўваць ужыванне пластыкавай упакоўкі, магчыма, і прынясе нейкія вынікі, аднак найлепш працуе менавіта ўласны прыклад. Калі бацькі будуць хадзіць па пакупкі з сумкамі, а не прыносіць штораз з крамы новы поліэтыленавы пакет з мноствам дробных фасовачных пакецікаў, а таксама сартыраваць смецце, якое падлягае перапрацоўцы, — тое ж будуць рабіць і дзеці. На экскурсію па палігоне і заводзе нас, дарослых, запрашалі якраз з малымі, каб яны «адчулі» смецце і вачыма, і носам. СТАР. 4

# СВЯТА ДРУЖБЫ І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адкрываючы XXVIII Міжнародны фестываль мастацтваў, Прэзідэнт павітаў усіх, «хто сэрцам адгукнуўся на пазыўныя міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар», усіх, дзякуючы каму не проста горад, а ўся наша Беларусь у літаральным сэнсе жыве мастацтвам, гучыць музыкай фестывальнага лета, гаворыць на розных мовах».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што амаль трыццаць гадоў таму, на пачатку 90-х, фестываль стаў адказам творчых людзей на распад вялікай шматнацыянальнай краіны. «Яны аб'ядналіся, каб захаваць братэрскія адносіны паміж новымі незалежнымі дзяржавамі. Гэта заканамерна: у няпросты час маральную апору людзі заўсёды знаходзілі ў мастацтве», — зазначыў Аляксандр Лукашэнка.



Невыпадкова своеасаблівай культурнай сталіцай трох дзяржаў стаў менавіта Віцебск. Тут пануе асаблівая энергетыка, якую перадалі ў сваіх творах знакамітыя мастакі Казімір Малевіч і Марк Шагал і якая шмат гадоў натхняе творчых людзей на стварэнне разнастайных фестываляў, многія з якіх і сёння адкрываюць імёны таленавітых музыкантаў, харэографаў, дызайнераў і мастакоў з Беларусі і замежжа.

Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы мастацкі форум захаваў свой статус нават пасля распаду Савецкага Саюза і стаў тым ядром, што аб'яднала не толькі славянскія, але і многія іншыя народы свету. «Сёння ў Віцебску мы ўжо чуем мову прадстаўнікоў Індыі, Кітая, Кубы, Ізраіля, Злучаных Штатаў Амерыкі. Мы ім рады. Традыцыйна ў ліпеньскія дні Віцебск уяўляе сабой прыклад самага гасціннага і музычнага горада», — адзначыў Прэзідэнт. Ён пажадаў канкурсантам фестывалю (а сёння ў творчую барацьбу ўступаюць маладыя выканаўцы) паспяховых выступленняў, журы — сумленнага судзейства, гледачам — станоўчых эмоцый і добрага настрою, каб душу сагравалі мелодыі любімых песень.



На сцэне Летняга амфітэатра Аляксандр Лукашэнка ўручыў спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», якой адзначаюцца дзеячы культуры, што зрабілі значны ўнёсак у сяброўства і культурнае супрацоўніцтва нашых краін. Сёлета гэта ўзнагарода прысуджана народнай артыстцы Украіны і Інгушэціі Таісіі Павалій. Кіраўнік беларускай дзяржавы пажадаў, каб яркі творчы шлях спявачкі стаў узорам для тых, хто робіць першыя крокі ў свеце музыкі — перадусім для ўладальніка Гран-пры Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2019». Гэтым уладальнікам, нагадаем, стала прадстаўніца Беларусі Ксенія Галецкая, якая таксама атрымала сваю «Ліру» з рук кіраўніка дзяржавы.




Адным з сюрпрызаў канцэрта адкрыцця «Славянскага базару» сталі тры трыа вядучых з краін-заснавальніц форуму — прадстаўнікі розных пакаленняў перадавалі эстафету адзін аднаму. Гэтую ж тэму творчай пераемнасці працягнулі прыгожыя і кранальныя дуэты Ядвігі Паплаўскай і Анастасіі Ціхановіч, дваіх Анатоляў Ярмоленкаў — дзеда і ўнука, расійскай спявачкі Варвары і юнай беларускай артысткі Ангеліны Ламакі. Свае песні, музычныя і харэаграфічныя нумары публіцы падарылі таксама Юлія Быкава, Алена Ланская, Таісія Павалій, Дзяніс Майданаў, Валерый Лявонцьеў, Тамара Гвердцытэлі, Ігар Саруханаў, Таццяна Буланава, Стас Міхайлаў, ансамблі «Сябры», «Арыэль» і «Самацветы», Омскі рускі народны хор, БДА «Песняры», артысты з Італіі, Малдовы, Чэхіі, Казахстана, ЗША і Швецыі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Уладзімір Зяленскі ўнёс у Вярхоўную раду законапраект аб люстрацыі топ-чыноўнікаў Украіны

Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі ўнёс у Вярхоўную раду законапраект аб люстрацыі чыноўнікаў, якія займалі пасады з 23 лютага 2014 года да 19 мая 2019 года, — такая інфармацыя размешчана на сайце парламента.

Аўтарам законапраекта выступіў сам Уладзімір Зяленскі і прапанаваў увесці люстрацыю для прэзідэнта Украіны, народных дэпутатаў, старшыні ВР, членаў урада, генеральнага пракурора, старшыні СБУ, кіраўнікоў антыманапольнага камітэта і Фонду дзяржмаёмасці, старшынь Дзяржаўнай фіскальнай службы і мытні, сакратара СНБА, кіраўніцтва абаронных прадпрыемстваў, якія займалі пасады з 23 лютага 2014 года да 19 мая 2019 года.

### У Трампа рэкордны рэйтынг. Другі тэрмін ужо ў кішэні?



Прэзідэнцкія выбары ў ЗША адбудуцца крыху менш чым праз паўтара года, аднак ужо цяпер амерыканскія палітолагі спрачаюцца пра тое, якім будзе іх вынік. Новым матэрыялам для аналізу сталі вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага на замову тэлекампаніі ABC і газеты The Washington Post (WP). Згодна з яго вынікамі, рэйтынг прэзідэнта ЗША Дональда Трампа дасягнуў максімальнага паказчыка з моманту інаўгурацыі дзякуючы паспяховай эканамічнай палітыцы.

Згодна з вынікамі апытання, праведзенага сярод прыкладна тысячы чалавек па ўсёй краіне ў перыяд з 28 чэрвеня да 1 ліпеня, ухваляюць работу Трампа на пасадзе кіраўніка дзяржавы 44 % рэспандэнтаў, супрацьлеглай думкі прытрымліваюцца 53 %.

Для Трампа гэта асабісты рэкорд, бо раней станоўчую ацэнку яго работы на пасадзе прэзідэнта ні разу не давала больш за 42 % рэспандэнтаў. Ды і гэты паказчык быў зафіксаваны толькі аднойчы — у красавіку 2017 года, праз чатыры месяцы пасля інаўгурацыі. Пры гэтым некалькі разоў яго рэйтынг падаў да 36 %.

Рост папулярнасці гаспадара Белага дома звязаны з тым, што яго эканамічную палітыку большасць рэспандэнтаў лічыць паспяховай. Станоўчую ацэнку ёй далі 51 % удзельнікаў апытання ABC і WP, адмоўную — 42 %.

У рэспандэнтаў ёсць усе падставы для аптымізму. Паводле звестак мінпрацы ЗША, беспрацоўе ў краіне ў красавіку гэтага года знізілася да 3,6 %. Гэта мінімальны паказчык з 1969 года. Ключавыя амерыканскія біржавыя індэксы на працягу апошніх месяцаў не раз абнаўлялі максімумы.

Далейшаму павышэнню рэйтынгу Трампа спрыяла б умацаванне сацыяльна-эканамічных паказчыкаў. Яно будзе залежаць, напрыклад, ад выніку гандлёвых спрэчак, якія вядуць ЗША з Кітаем і шэрагам іншых краін. Перамога ў іх адназначна павысіла б шанцы Трампа на перавыбранне.

### Базельскі ўніверсітэт апублікаваў унікальны папірус эпохі ранняга хрысціянства

Ліст, напісаны на кавалку папірусу ў пачатку трэцяга стагоддзя нашай эры, выяўлены ў калекцыі Базельскага ўніверсітэта, стаў навуковай сенсацыяй. Вучоныя выявілі, што гаворка ідзе пра ўнікальны гістарычны дакумент, які пралівае святло на побыт і сямейныя адносіны часоў ранняга хрысціянства.

«Гэты ліст адносіцца да 230-х гадоў нашай эры, і, значыць, ён старэйшы за ўсе іншыя раней вядомыя хрысціянскія дакументы эпохі рымскага Егіпта», — адзначае Базельскі ўніверсітэт на сваім сайце, расказваючы пра адкрыццё. Жыццё ранніх хрысціян у Рымскай імперыі нярэдка ўяўляюць як вельмі цяжкае з-за праследаванняў, якія пагражалі ім. Аднак змест паслання, якое адправіў у тыя далёкія часы жыхар Егіпта Арыянус свайму брату Паўлусу, цалкам абвяргае такі падыход. З папіруса вынікае, што хрысціяне жылі, у прыватнасці, ва ўнутранай частцы гэтай рымскай правінцыі, дзе займалі кіруючыя пазіцыі і не адрозніваліся па ладзе свайго штодзённага жыцця ад суайчыннікаў-язычнікаў.

Навукоўцы прыйшлі да высновы, што пасланне напісана хрысціянінам, таму што ў канцы тэксту Арыянус жадае брату дабрадзенства «ў Госпадзе». Як лічаць эксперты, аўтар ліста выкарыстоўвае кароткую форму хрысціянскага выслоўя: «Я малюся, каб ты атрымаў поспех у Госпадзе».



**Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка

Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 99 лет земельного участка с кадастровым № 224685008101000047, площадью 0,2492 га по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, Славновский с/с, д. Молявка, ул. Центральная, 15 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации, сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Плиса), в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 В. **Нач. цена:** 523,32 руб. **Задаток:** 52,33 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY44AKBB36003270795430000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 4002, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Славновский сельисполком)

**Дата, время и место проведения аукциона:** 13.08.2019 в 12.00 по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1 в Толочинском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 15.07.2019 с 8.30 по 12.08.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона — победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды зем. участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 2 рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе аукциона либо в протоколе признания аукциона несостоявшимся заключить со Славновским сельисполкомом договор аренды зем. участка; в течение 2 месяцев со дня заключения договора аренды зем. участка обратиться за гос. регистрацией зем. участка и прав на него в Толочинское бюро Оршанского ф-ла РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить разрешительную документацию на строительство жилого дома в Толочинском райисполкоме; в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него приступить к занятию предоставленного зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); до начала строительства снять плодородный слой в местах размещения строений и сооружений и использовать его на улучшение приусадебного зем. участка; по окончании срока аренды зем. участка совместно со Славновским сельисполкомом решить вопрос его дальнейшего использования. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 — зем участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе граждане, консолидированные участники (лично либо через своего представителя) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного гражданина — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт.тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

Прыёмная кампанія — 2019

# КОШТ НАВУЧАННЯ ПАДРОС, АЛЕ НЯЗНАЧНА

**Учора прыёмныя камісіі беларускіх ВНУ распачалі прыём дакументаў у абітурыентаў. Звычайна першымі ў прыёмныя камісіі прыходзяць уладальнікі вельмі высокіх балаў. У БДУ, напрыклад, падалі дакументы пяць абітурыентаў з сумай балаў, большай за 391. У адной дзяўчыны, якая паступае на факультэт міжнародных адносін, амаль максімум — 399 балаў.**


edu.gov.by

У БДУІР на вельмі прэстыжным факультэце камп'ютарных сістэм і сетак свой намер навучацца аформілі некалькі чалавек, якія маюць больш чым 381 бал. Уладальнікі такой сумы балаў ёсць і сярод абітурыентаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

У першы дзень падачы дакументаў **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** наведаў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, дзе азнаёміўся з ходам уступнай кампаніі, а таксама прысутнічаў на сумоўі з выпускнікамі педагагічных класаў. Міністр адзначыў, што яму як кіраўніку Мінадукацыі неабыякава, хто будзе працаваць педагогам. «Цікава паглядзець, што гэта за абітурыенты і з якім багажом яны прыйшлі», — заўважыў ён.

Міністр нагадаў, што ў Беларусі выбудоўваецца новая сістэма дзяржзаказу кадраў, якая арыентавана ў першую чаргу на патрэбы эканомікі і яе перспектывы. Менавіта таму павялічыўся прыём на тэхнічныя і тэхналагічныя, медыцынскія і IT-спецыяльнасці. Усяго ў 2019 годзе ў ВНУ Беларусі плануецца прыняць 54,7 тысячы чалавек, што на 1 % больш за план прыёму мінулага года. Чакаецца, што студэнтамі бюджэтнай формы навучання стануць 26,6 тысячы чалавек — гэта на 0,7 % перавышае план прыёму 2018 года.

Міністр запэўніў, што прыёмная кампанія праходзіць спакойна і ўпэўнена, а таксама пракаментаваў павышэнне кошту навучання ў ВНУ. Ён падкрэсліў, што «цана падрасла нязначна». Паводле яго слоў, у ВНУ Міністэрства адукацыі павышэнне вагаецца ад 100 да 300 рублёў. Усяго ў Беларусі функцыянуе 51 вышэйшая навучальная ўстанова, але ў падпарадкаванні Міністэрства адукацыі знаходзіцца толькі 21.

Напярэдадні некаторыя беларускія ВНУ размясцілі на сваіх сайтах кошт навучання ў 2019/2020 навучальным годзе, сярод іх Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка.

Напрыклад, у БНТУ кошт навучання на першым курсе вагаецца ў залежнасці ад спецыяльнасці ад 3380 да 3605 рублёў за год. У БДЭУ незалежна ад спецыяльнасці першакурснікам давядзецца плаціць 2564 рублі, студэнтам другіх—чацвёртых курсаў — 2463 рублі. У Акадэміі кіравання цэннік адзін для ўсіх студэнтаў — 3200 рублёў. У БДПУ кошт на спецыяльнасцях з вывучэннем замежнай мовы вар'іруецца ад 1966 рублёў для выпускнога курса да 2666 — для студэнтаў першага. Даражэй за ўсё абыдзецца навучанне для студэнтаў-першакурснікаў, якія выберуць спецыяльнасці «музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія», «музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура» — 2800 рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Класныя навіны

# ЗАМЕСТ «ЧАРЧЭННЯ» — «ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ»

**З 1 верасня беларускія дзевяцікласнікі змогуць вывучаць асобныя прадметы на павышаным узроўні. Раней такая магчымасць была толькі ў навучэнцаў 8, 10 і 11 класаў.**

У тыпавых вучэбных планах агульнай сярэдняй адукацыі на 2019/2020 навучальны год змянілася колькасць гадзін на вывучэнне асобных вучэбных прадметаў у 9 класе. Як тлумачаць у галоўным адукацыйным ведамстве, абноўленыя навучальныя праграмы ўкараняюцца ў адукацыйны працэс паэтапна пачынаючы з 2015/2016 навучальнага года. У 2019/2020 навучальным годзе па новых праграмах будуць вучыцца дзевяцікласнікі, тым чынам абнаўленне зместу адукацыі на I і II ступенях (з 1-га па 9 клас) завершыцца.

Усе нававядзенні закліканы спрасціць змест адукацыі і прывесці яго ў адпаведнасць з узроставымі пазнавальнымі магчымасцямі школьнікаў.

Навучальныя праграмы для дзевяцікласнікаў зведалі практычна тыя ж змены, што і праграмы для 5—8 класаў. Па-першае, адбылося пераразмеркаванне вучэбнага матэрыялу. Частка найбольш складанага (па фізіцы, хіміі) перанесена ў 10 і 11 класы. Быў выключаны найбольш складаны вучэбны матэрыял, які не мае практычнай значнасці для выпускнікоў дзявятага класа, скарочаны пералік абавязковых для засваення паняццяў. Рэалізаваныя міжпрадметныя сувязі, каб, напрыклад, пры вывучэнні фізікі школьнікі маглі абапірацца на веды па матэматыцы. Павялічаны час, які выдзяляецца на паўтарэнне і замацаванне вывучанага матэрыялу і рашэнне задач па матэматыцы.

Разам з тым у 9 клас з 10-га было перанесена вывучэнне геаграфіі Беларусі. Асобныя тэмы па фізіцы, наадварот, перанеслі ў 9 клас з 7-га. Напрыклад, па фізіцы з праграмы для 7 класа ў праграму для 9-га перанесены простыя механізмы, закон Архімеда, а таксама некаторыя лабараторныя работы. У першым паўгоддзі вывучэнню фізікі прысвячаюцца тры гадзіны ў тыдзень.

А вось вывучэнне прадмета «Чарчэнне» было вырашана перанесці ў 10 клас (ён будзе вывучацца ў дзясятым класе пачынаючы з 2020/2021 навучальнага года).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Шэнген» можа істотна падаражэць




Кошт шэнгенскіх віз для грамадзян Беларусі можа вырасці з 60 да 80 еўра з 2 лютага 2020 года. Такую інфармацыю пацвердзілі ў прадстаўніцтве ЕС у Беларусі.

Акрамя таго, кошт віз для дзяцей ва ўзросце ад шасці да дванаццаці гадоў стане 40 еўра, тады як зараз гэты збор складае 35 еўра.

Разам з тым змены ў візавых правілах маюць і шэраг плюсоў для падарожнікаў, асабліва тых, хто часта наведвае краіны, якія ўваходзяць у Шэнгенскую дамову. У іх ліку з'явіцца магчымасць падаваць заяўку на атрыманне візы за паўгода да даты планаванай паездкі замест цяперашніх трох месяцаў.

Акрамя таго, з'яўляюцца выразныя крытэрыі для атрымання шматразовых віз максімальнай працягласцю да 5 гадоў. Скарыстацца такой магчымасцю змогуць тыя, хто неадназова атрымліваў візы на меншы тэрмін і законна іх выкарыстаў.

Аднак грамадзян Беларусі змяненні ў частцы кошту віз могуць і не закрануць, бо ў апошнія гады бакамі вялася работа над пагадненнямі з ЕС па спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі. «Работа над гэтымі дамовамі практычна завершана. Проста для таго, каб прыступіць да фінальнай стадыі падпісання, павінна быць пройдзена адпаведная працэдура і ўнутры Еўрапейскага саюза, і ў нас. Павінны быць прааналізаваныя і ўзважаныя ўсе моманты. Я перакананы, што мы зможам завяршыць гэтую работу ў найбліжэйшы час», — заяўляў у маі міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей.

У выпадку падпісання адпаведных дакументаў і іх уступлення ў сілу да 2 лютага 2020 года кошт шэнгенскіх віз для грамадзян Беларусі знізіцца з цяперашніх 60 да 35 еўра. Прадугледжаны і шэраг іншых паслабленняў.

Жніво-2019

# На Міншчыне стартавала ўборка збожжавых

**На Міншчыне пачалося жніво. У прыватнасці, на 11 ліпеня азімы рапс убраны на плошчы больш за 40 % ад агульнага аб'ёму. Паступова раёны, пераважна паўднёвыя, прыступаюць да ўборкі збожжавых культур, у асноўным азімага ячменю.**

— На ўборцы збожжавых і зернебабовых будзе задзейнічана 1988 камбайнаў. Гэтага дастаткова, каб правесці работы ў агратэхнічныя тэрміны. Нагрузка на адзінку тэхнікі складзе 255 гектараў, — расказаў **старшыня Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ.** — Фактычна на 11 ліпеня гатоўнасць збожжаўборачных камбайнаў складае 96 %, зернесушыльных комплексаў — прыкладна 98 %. Але ёсць і праблемы: пятнаццаць сельгасарганізацый выклікаюць пэўную заклапочанасць. У адных гатоўнасць каля 80 %, у іншых — крыху больш за 60 %. Іх нямнога, і яны ў цэлым не сыграюць негатыўнай ролі па вобласці. Разам з тым шчыльна працуем з імі па выпраўленні становішча. Усяго ж на Міншчыне няспраўныя 72 збожжаўборачныя камбайны ў 64 гаспадарках. Я думаю, праз дзень-другі сітуацыя зменіцца. Мы трымаем яе на кантролі. У Мінскай вобласці 85 % камбайнаў айчыннай вытворчасці, таму праблем з запаснымі часткамі няма.

Між іншым, у цэнтральным рэгіёне планамерна вырашаецца пытанне аб папаўненні парка збожжаўборачных камбайнаў. Летась набылі сто адзінак, сёлета — васямнаццаць. У наступным годзе плануецца далейшае тэхнічнае абнаўленне, таму што амаль палова камбайнаў выкарыстоўваецца больш за дзесяць гадоў і толькі 10 % служыць менш пяці... Вядома, гэта ўплывае на тэмпы ўборкі. Але пры дбайных адказных адносінах і старая тэхніка дае вынікі. Напрыклад, самы састарэлы камбайнавы парк у Дзяржынскім і Нясвіжскім раёнах, але яны традыцыйна адны з першых выходзяць у поле.

У цэлым Міншчына забяспечаная на час жніва кадрамі, сельгасмашынамі. Тым не менш плануецца прыцягнуць з арганізацый вобласці 305 адзінак тэхнікі і 423 спецыялістаў рознай кваліфікацыі. Не застанецца ўбаку ад справы дзяржаўнай важнасці і сталіца, якая накіруе на ніву Міншчыны 177 адзінак тэхнікі, 152 чалавекі. Гаспадаркі, раёны, якія першымі закончаць жніво, будуць дапамагаць суседзям. Як сведчыць вопыт мінулых гадоў, такая практыка дае станоўчыя вынікі.

— Масавая ўборка збожжавых і зернебабовых залежыць ад умоў надвор'я. Пакуль яны неспрыяльныя, — адзначыў Сяргей Ляўковіч. — У пачатку чэрвеня ішлі моцныя ліўні, быў шквалісты вецер, што паўплывала на стан культур: 30 % іх палегла — каля 170 гектараў. — Гэта створыць пэўныя праблемы і ў першую чаргу адаб'ецца на тэмпах жніва. Каб убраць палегліцу максімальна без страт, прыкладзём усе намаганні. Няхай будзе марудней, але больш якасна. У цэлым жа мяркуем сабраць ураджай не ніжэй леташняга ўзроўню.

Самае галоўнае, на думку старшыні камітэта, — правільна, па-гаспадарску выкарыстаць дары нівы. У першую чаргу трэба выканаць дзяржаўны заказ у памеры 200 тысяч тон збожжа, разлічыцца з пастаўшчыкамі за таварныя і матэрыяльныя каштоўнасці. Ні ў якім разе нельга дапускаць продаж гаспадаркамі зерня на шкоду жывёлагадоўлі.

— На жаль, мы маем горкі вопыт, калі ў нас было недастаткова кармоў, што ўплывае на выніку работы ў гэтай галіне. Таму задача кожнага кіраўніка — забяспечыць пагалоўе фуражным збожжам, каб мець стабільную эканамічную сітуацыю на працягу ўсяго года да новага ўраджаю. Акрамя таго, неабходна забяспечыць кожную сельгасарганізацыю танным бялком на перспектыву. У гэтым кірунку выпрацаваны пэўныя падыходы як на ўзроўні вобласці, так і раёнаў, — падкрэсліў Сяргей Ляўковіч.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ЯК РАТАВАЛІ КАЧАНЯТ

**У Мінску работнікі МНС выратавалі качанят з ліўневай каналізацыі, паведамляе сайт гарадскога ўпраўлення МНС.**

Учора ў 8.05 на нумар 101 ад прахожых паступіла паведамленне, што на праспекце Пераможцаў каля гасцініцы «Юбілейная» патрэбная дапамога качанятам. Некалькі качанят праваліліся ў люк дажджавой каналізацыі і самастойна выбрацца не маглі. Ратавальнікі дасталі сем птушанят з ліўнёўкі і пазней выпусцілі да маці, якая ўвесь гэты час чакала іх непадалёку.



# ЯК ЭКСКУРСІЯ ЗМЯНІЛА СВЕТАПОГЛЯД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*— На думку вучоных, прыблізна 40 % упакоўкі служыць нам менш чым месяц. Адзін месяц выкарыстання — і мы атрымліваем смецце, якое будзе жыць сотні гадоў,* — кажа **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар дзяржустановы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** *— Паказваючы людзям, як выглядае палігон, мы спадзяёмся, што яны больш не будуць бяздумна ставіцца да ўпакоўкі і зменяць свае спажывецкія звычкі.*



Ідэя не браць пакеты на касе мае сэнс, ведаю гэта на ўласным вопыце. Адмаўляюся ад іх каторы месяц, і ў крамах, дзе з'яўляюся больш-менш рэгулярна, ужо не здзіўляюцца гэтаму і не ўгаворваюць, паўтараючы, што яны бясплатныя. А днямі касір, прыгледзеўшыся да мяне і пра нешта падумаўшы, замест звыклай фразы: «Ці патрэбны вам пакет?» — спытала ўжо хутчэй сцвярджальна: «Вам пакет не патрэбны?» Так што няхай малюсенечкі, але крок на шляху памяншэння колькасці пластыку мы з ёй зрабілі.



Тым не менш у Беларусі штомесяц выпрабляюць больш за 700 тон ПЭТ-пакетаў, з якіх 200 тон — фасовачных і нібыта бясплатных. Ці такія яны бясплатныя і хто за іх плаціць, нам расказалі спецыялісты.

**«Аднойчы вярнулі канспект дзяўчыне, якая высветліла, што смеццявоз пайшоў на завод. Нас папярэдзілі пра здарэнне, і мы знайшлі-адсарціравалі яго з агульнай масы паперы».**

## ШТО КУДЫ

На смеццеперапрацоўчым сарціровачным заводзе прадпрыемства «Спецкамунаўтатранс», што каля палігона «Трасцянецкі», прысутным выдалі маскі, каб асабліва ўражлівым асобам не стала дрэнна ад паху, і правялі невялікі экскурс у гісторыю стварэння прадпрыемства.

Пачаў работу завод у 2016-м, тады ж задумаліся над тым, каб павялічыць колькасць другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), якія вымаюцца са смецця, і зменшыць аб'ёмы не прыдатных ні да чаго адходаў.

За год мінчане «прэзентуюць» прадпрыемству больш за мільён тон цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА). Вымаюць з гэтага смецця другасныя рэсурсы ўручную (не самая зручная тэхналогія, але іншай не існуе).

Смеццявозы на ўездзе на прадпрыемства ўзважваюць. Пасля разгрузкі таксама ўзважваюць — так разумеюць, колькі смецця прыбыло на перапрацоўку. Далей адходы трапляюць у прыёмнае аддзяленне, дзе высвятляецца, ці ёсць тут што карыснае для перапрацоўкі. Адтуль смецце паступае на лініі сарціроўкі. Спачатку сарціроўшчыкі адбіраюць шкляную тару, слоікі, бутэлькі, рэшткі посуду, тарнае шкло і смецце буйных памераў. (Шлях апошняга — на палігон, шкло ідзе ў кантэйнеры для наступнай перапрацоўкі.) Астатняе трапляе па лініі далей — у вялікі барабан, дзе механічна адсарціроўваюцца і прэсуюцца арганічныя адходы.

*— Адтуліна памерам 70 мм аптымальная, каб ПЭТ-бутэлька ці шкло, што трапіла сюды, не праваліліся і не пайшло ў звычайнае арганічнае смецце, якое адпраўіцца на схаванне,* — тлумачыць **Аляксей ТАРАРУК, начальнік вытворчасці УП «Спецкамунаўтатранс».**

На лініі сарціроўкі кожны работнік адбірае дакладны від карыснага смецця, якому можна даць другое жыццё. (Тое, што перапрацоўцы не паддаецца, адвозіцца за межы сарціроўкі і «едзе» на палігон.) З адной лініі па трубе-мяху ў сеткавы кантэйнер выскокваюць ПЭТ-бутэлькі. Пластыкавая бутэлька з накрыўкай, перш чым быць спрасаванай і адправіцца на перапрацоўку, праколваецца. З другой лініі праз адтуліны ў спецыяльныя загоны мякка апускаецца поліэтыленавае смецце. З трэцяй гэтак жа плаўна вылятаюць папера і кардон. Гэтая сыравіна таксама пасля адправіцца на перапрацоўку.

Спецыяльным вялізным магнітам — сепаратарам прыцягваецца металічнае смецце: бляшанкі, упакоўкі з-пад лаку для валасоў і іншае, што таксама будзе перапрацавана.

## ЗГУБЛЕНЫЯ Ў СМЕЦЦІ

Праблема, якая непакоіць людзей і пра якую яны найчасцей пытаюцца: «Чаму з усіх трох кантэйнераў для асобнага збору смецця адходы забіраюцца адным смеццявозам, ці варта ў такім выпадку сартаваць?». Варта, упэўнены спецыялісты, бо пасля гэтае смецце едзе на дасарціроўку і адпраўляецца на перапрацоўку. Нават ПЭТ-бутэлькі, якія складваюцца ў кантэйнер для пластыку, маюць розны склад, і іх трэба перабіраць, у тым ліку нават па колеры.

*— Забіраючы адходы адным транспартам, мы можам плаціць за вываз пэўную суму, бо калі за кожным відам другасных рэсурсаў будзе прыязджаць асобны транспарт, паслуга падаражэе ўтрая.*

Наступнае пытанне, якое паступіла ад турыстаў: «Ці можна вярнуць каштоўную рэч, якую незнарок сам выкінуў у смецце?».

**«На думку вучоных, прыблізна 40 % упакоўкі служыць нам менш чым месяц. Адзін месяц выкарыстання — і мы атрымліваем смецце, якое будзе жыць сотні гадоў».**

*— Аўтамабіль не ездзіць хаатычна, а ходзіць па пэўным маршруце, таму можна высветліць, у якім смеццявозе паехалі адходы з вашай сметніцы,* — тлумачыць спецыяліст. *— Аднойчы мы, напрыклад, вярнулі канспект дзяўчыне, якая высветліла, што смеццявоз пайшоў да нас на завод. Нас папярэдзілі пра здарэнне, і мы знайшлі-адсарціравалі яго з агульнай масы паперы.*

Пасля цэха мы адправіліся на незвычайны шпацыр на палігон. Карціна тут амаль што апакаліптычная. Гектары featurelessрознакаляровага смецця ў кар'еры, бясконцыя машыны, якія, здаецца, штохвілінна падвозяць новыя адходы, а над усім — безліч крылатых жыхароў палігона: чаек, якія з крыкамі лунаюць у паветры... Міжволі задумваешся, што калі не маняць свядомасць, свет ператворыцца ў такую вось звалку, жыхарамі якой мы ўсе станем і будзем сноўдаць па ёй па калена ў смецці ў пошуках чагосьці патрэбнага.

## ДАЙЦЕ ІМ ШАНЦ

Для кожнага віду ДМР існуюць патрабаванні. Забруджаная папера, на жаль, не можа быць перапрацавана і заканчвае жыццё на палігоне. Бутэлькі, у якіх застаецца нейкая вадкасць, таксама не трапяць на перапрацоўку, бо гэта патрабуе занадта вялікіх трат, заўважыў Аляксей Тарарук.

*— Каб аблегчыць нам працу, кладзіце ў кантэйнеры для асобнага збору смецця хаця б тое, што абазначана на іх,* — заклікаў прадстаўнік Спецкамунаўтатрансу. *— Бясплатныя пакеты, якія вам даюць на касе, насамрэч не бясплатныя, а ўключаны ў кошт тавару. Павінен прайсці час, каб вытворцы сталі карыстацца шматразовай тарай.*



Пакеты з-пад малака, перш чым выкінуць, мыць не трэба. А вось цэлафан лепш адчысціць ад рэштак ежы. Паперу таксама варта выкідваць сухую і незабруджаную, каб даць ёй шанц.

*— Мы пачалі асобна сартаваць для перапрацоўшчыкаў блакітныя ПЭТ-бутэлькі, асобна — тэтрапакі. Тона празрыстай ПЭТ-бутэлькі, напрыклад, каштуе больш за 800 рублёў,* — расказвае спецыяліст. *— А накрыўкі ад пластыкавых бутэлек — увогуле каштоўная сыравіна. Калі збераце мех такога смецця і завезяце на перапрацоўчы завод «Рэпласт», што ў Магілёве, ваша паездка акупіцца выручанымі за гэтае смецце грашыма.*



Самае галоўнае — прывучыць сябе сартаваць смецце і не кідаць, не задумваючыся, у сметніцу ўсё запар. А яшчэ лепш — старацца набываць тавары ў тары, прыдатнай для перапрацоўкі, шкле ці паперы, і перадаваць дзецям гэтую звычку.

**Ірына СІДАРОК.**

**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

# Лічба правіць поштай?

**Адыходзячы тыдзеньператварыў Мінск у пляцоўку для абмеркавання праблем і выклікаў, з якімі цяпер сутыкаецца паштовая галіна. Прадстаўнікі апаратараў з 30 краін сабраліся ў сталіцы падчас Рэгіянальнага стратэгічнага форуму Сусветнага паштовага саюза для краін Еўропы і Цэнтральнай Азіі. Сусветны паштовы саюз мяркуе правесці сёлета шэсць падобных мерапрыемстваў.**



**Генеральны дырэктар міжнароднага бюро Саюза Бішар ХУСЭЙН** зазначыў, што гэтая структура — адна з найбуйнейшых сетак у свеце.



— Мяркуйце самі: Сусветны паштовы саюз аб'ядноўвае 192 краіны, у якіх працуе больш за 650 тысяч паштовых аддзяленняў. Іх штат, у сваю чаргу, складае больш за сем мільёнаў супрацоўнікаў. Таму мы чарговы раз вырашылі аб'яднаць сумесныя намаганні, каб разгледзець пытанні, скіраваныя на развіццё бізнесу і лагістычнага сектара. Таксама ў нашых інтарэсах зрабіць усё, каб адпавядаць патрабаванням, якія прад'яўляе зараз да нас сусветны рынак. А ў эпоху імклівага развіцця лічбавых тэхналогій гэта актуальна як ніколі, паколькі цяпер рашэнні павінны прымацца хутка. Але мушу зазначыць, што пошта ніколі не была супраць тэхналогій. Наадварот, мы заўжды бралі іх на ўзбраенне, каб аказваць больш якасныя паслугі на сучасным узроўні. Калі не было сучаснага транспарту, мы выкарыстоўвалі коней. З'явілася чыгунка, авіяцыя — мы сталі іх задзейнічаць. Карысць тэлефона і тэлеграфа мы калісьці ацанілі таксама вельмі хутка. З'явіўся інтэрнэт — зрабілі і яго памочнікам. А цяпер будзем выкарыстоўваць дроны і штучны інтэлект.

Як расказаў **міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі Канстанцін ШУЛЬГАН,** асноўная мэта форуму — вызначыць асноўныя кірункі і перспектывы развіцця паштовай службы. А таксама зразумець, як ва ўмовах лічбавай трансфармацыі будзе развівацца паштовы сектар.



— Немалаважна гэтыя правілы ведаць для таго, каб унутраныя планы беларускай пошты пралічваць з карэкцыроўкай на міжнародную стратэгію развіцця. Асноўная задача — давесці нашы цяперашнія паслугі да якасна іншага складу. Гэта праца цяжкая, яна зойме не адзін дзень. Разам з тым інфарматызацыя і аўтаматызацыя ўваходзяць у наша жыццё дастаткова хутка. Яны павінны быць перакладзены на тыя паслугі, якія мы аказваем, для таго, каб некаторыя з іх кардынальна змяніліся, а іншыя набылі больш зручны выгляд для карыстальніка. І ў перспектыве — пашырыць кола паслуг, якія можа аказваць нацыянальны паштовы апаратар. Паралельна з стварэннем нацыянальнай электроннай паштовай сістэмы, якое ўжо ўвайшло ў закон аб паштовай сувязі, гаворыць аб тым, што акцэнт будзе рабіцца на электронныя паслугі. Але і ад стандартнага набору мы адмаўляцца ні ў якім разе не плануем. Яны будуць паступова набываць электронную абалонку для павышэння якасці паслуг.

Што ж даюць такія форумы? Кожны рэгіён улічвае свае адметныя асаблівасці і кірункі дзейнасці пры фарміраванні глабальнага парадку дня. Паштовыя службы ў свеце падвяргаюцца сур'ёзным выклікам. Але наш паштовы сектар назапасіў вялікі досвед у частцы аказання ўніверсальных паслуг і выканання дзяржзаўнага сацыяльнага стандарту. Таму ён — надзейны партнёр для ўрада ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця і стварэння трывалай інфраструктуры, якая садзейнічае ўсёабдымнаму ахопу і ўкараненню інавацый.

— Першаснае значэнне набывае пытанне рэгулявання адносін у галіне паштовых паслуг і эфектыўнае комплекснае міжнароднае рэгуляванне, прыкладам якога з'яўляецца дадзены форум, — працягвае Канстанцін Шульган. — Беларусь высока ацэньвае ўклад СПС у развіццё паштовага сектара ў цэлым, а таксама магчымасць весці прамы канструктыўны дыялог з нашымі калегамі на такім высокім сусветным узроўні.

**Генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Уладзімір МАТУСЕВІЧ** прытрымліваецца думкі, што лічбавізацыя паштовых паслуг будзе ісці паступова.

— Мы вельмі рады, што ёсць магчымасць правесці такі форум менавіта ў Мінску, на нашай пляцоўцы. Гэта не толькі выпрацоўка стратэгіі развіцця, але і магчымасць абмену досведам. Ёсць чаму павучыцца ў калег з Еўропы. Напрыклад, развіццю лічбавых тэхналогій, трансфармацыі паштовых паслуг у лічбавую сферу. Ды і так існуе цэлы шэраг пытанняў, пачынаючы ад нарматыўна-прававога рэгулявання да практычнай дзейнасці. Мы ж, у сваю чаргу, імкнёмся пераймаць толькі самае лепшае.

Сярод іншых высокіх гасцей форуму Мінск наведалі намеснік генеральнага дырэктара Міжнароднага бюро СПС Паскаль Кліва, генеральны сакратар «ПостЕўропа» Батонд Сцэбені, генеральны сакратар Панафрыканскага паштовага саюза Юнус Джыбрын.

Рэгіянальны стратэгічны форум Сусветнага паштовага саюза ў Мінску праводзіўся з мэтай падрыхтоўкі да 27-га кангрэса Сусветнага паштовага саюза, які адбудзецца ў Абіджане ў 2020 годзе. Сусветны паштовы кангрэс з'яўляецца вышэйшым органам СПС. Ён склікаецца раз на чатыры гады для разгляду стратэгічных пытанняў паштовай сувязі і вызначае агульную праграму дзейнасці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота БелТА.**

## Цікава ведаць

● Сусветны паштовы саюз быў створаны ў 1874 годзе ў адпаведнасці з Бернскай дамовай. Місія, якая была ўскладзена на арганізацыю 145 гадоў таму, — гэта выпрацаваць міжнародныя нормы паштовага абслугоўвання на ўсіх узроўнях. Гэтую задачу супольнасць выконвае і цяпер. Беларусь стала яе членам у 1947 годзе.

● Членства ў Сусветным паштовым саюзе шмат дае нашай краіне. У прыватнасці — магчымасць абмену міжнароднымі паштовымі паведамленнямі па адзіных прынцыпах і тэхналогіях, свабоду транзіту сваіх паштовых адпраўленняў. Пры міжнародным абмене выкарыстоўваецца адзіны парадак узаемаразлікаў па канчатковых выдатках.

# ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ У КІТАІ

**Добрая навіна прыйшла з Паднябеснай. У горадзе Ухань праходзіла Сусветная выстаўка марак. Экспазіцыя «Белпошты» была ўганаравана на ёй дзвюма ўзнагародамі.**

Залаты медаль быў прысуджаны за экспазіцыю Pride of Belarus (паштовыя маркі 2016—2018 гадоў). Яна ўдзельнічала ў групе В, якая аб'ядноўвае краіны, дзе выпускаецца ад 30 да 69 паштовых марак у год.

«Серабро» выйграла кніга «Паштовыя маркі Рэспублікі Беларусь. 2015» па выніках конкурснага класа «Філатэлістычная літаратура».

На выстаўцы былі прадстаўлены шырокі асартымент паштовых марак Беларусі. Рэалізавана больш за 10 тысяч адзінак прадукцыі. Самая вялікая запатрабаванасць — у марак з нацыянальнымі сімваламі краіны, геральдыкай, адзеннем, архітэктурай, флорай і фаўнай.



Усяго на выстаўцы паказалі больш за чатыры тысячы экспанатаў з 84 краін і рэгіёнаў свету. Арганізатарам яе стаў Сусветны паштовы саюз.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК. Фота РУП «Белпошта».**

# СУПРАЦЬ КАРУПЦЫІ



**11 ліпеня ў зале Выканаўчага камітэта СНД у межах V пасяджэння Міждзяржаўнага савета па супрацьдзеянні карупцыі быў прэзентаваны паштовы праект, прымеркаваны да гэтай падзеі.**




У цырымоніі ўрачыстага гашэння мастацкага маркіраванага канверта ўдзельнічалі міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган і Генеральны пракурор Аляксандр Канюк.

Міждзяржаўны савет па супрацьдзеянні карупцыі — орган галіновага супрацоўніцтва СНД.

# Стаж вымяраецца дзесяцігоддзямі

**Наша падпісчыца Таццяна НЯДЗЕЛЬКА 35 гадоў адпрацавала ў сферы бытавога абслугоўвання. Ужо больш за 22 гады яна выпісвае газету «Звязда». Чытачы падабаюцца кулінарныя рэцэпты, парады па хатняй гаспадарцы, асвятленне злабадзённых праблем.**

Участак, на якім жыве Таццяна Нядзелька, абслугоўвае паштальён Петрыкаўскага ўчастка паштовай сувязі Калінкавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Людміла ЗУБАР. Яна працуе ўжо больш за 20 гадоў.




Але ў паштальёнаў, як вядома, графік рабочага тыдня адрозніваецца ад класічнага 5/2. Таму ў той дзень, калі быў зроблены гэты кадр, свежую «Звязду» для Таццяны НЯДЗЕЛЬКІ даставіла паштальён Ніна ПЕРАРЭЖКА.

**Алена ДАЎЖАНОК, фота аўтара.**

БТА БАНК

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ НА 31 ДЕКАБРЯ 2018 ГОДА

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | 31 декабря 2018 года | 31 декабря 2017 года |
|---|---|---|
| **Активы** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 21 967 | 26 039 |
| Обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь | 1 212 | 726 |
| Средства в кредитно-финансовых организациях | 2 038 | 1 333 |
| Кредиты клиентам | 133 755 | 70 439 |
| Инвестиционные ценные бумаги, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 32 910 | 30 954 |
| Основные средства и нематериальные активы | 10 339 | 9 472 |
| Активы по отложенному налогу на прибыль | 689 | 14 |
| Прочие активы | 661 | 427 |
| **Итого активы** | **203 571** | **139 404** |
| **Обязательства** | | |
| Средства кредитно-финансовых организаций | 19 964 | 6 170 |
| Средства клиентов | 104 423 | 70 871 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 20 820 | 6 245 |
| Обязательства по текущему налогу на прибыль | 62 | 13 |
| Прочие обязательства | 674 | 503 |
| Субординированный кредит | 12 959 | 11 836 |
| **Итого обязательства** | **158 902** | **95 638** |
| **Капитал** | | |
| Акционерный капитал | 45 318 | 45 318 |
| Накопленный убыток | (5 676) | (5 742) |
| Фонд переоценки инвестиционных ценных бумаг | 6 | (64) |
| Фонд переоценки основных средств | 5 021 | 4 254 |
| **Итого капитал** | **44 669** | **43 766** |
| **Итого капитал и обязательства** | **203 571** | **139 404** |

## ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2018 ГОДА

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|
| **Процентные доходы** | | |
| Кредиты клиентам | 9 144 | 8 922 |
| Инвестиционные ценные бумаги, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 1 380 | 2 350 |
| Средства в кредитно-финансовых организациях | 35 | 306 |
| **Процентные расходы** | **10 559** | **11 578** |
| Средства клиентов | (2 617) | (2 190) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | (1 266) | (115) |
| Средства кредитно-финансовых организаций | (1 232) | (201) |
| Субординированный кредит | (926) | (875) |
| | **(6 041)** | **(3 381)** |
| **Чистый процентный доход** | **4 518** | **8 197** |
| Резерв под обесценение финансовых активов | 785 | 1 470 |
| **Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов** | **5 303** | **9 667** |
| Чистые комиссионные доходы | 4 845 | 2 035 |
| Чистые доходы по операциям в иностранной валюте | | |
| - торговые операции | 1 175 | 247 |
| - переоценка валютных статей | 572 | 1 037 |
| Чистые расходы по инвестиционным ценным бумагам, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | (31) | (66) |
| Прочие доходы | 441 | 365 |
| **Непроцентные доходы** | **7 002** | **3 618** |
| Расходы на персонал | (6 690) | (6 865) |
| Амортизация | (529) | (483) |
| Прочие операционные расходы | (4 110) | (3 825) |
| **Непроцентные расходы** | **(11 329)** | **(11 173)** |
| **Прибыль до налогообложения** | **976** | **2 112** |
| Возмещение/(расход) по налогу на прибыль | 299 | (176) |
| **Чистая прибыль** | **1 275** | **1 936** |
| **Прочий совокупный доход** | | |
| *Прочий совокупный доход, не подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах* | | |
| Результат от изменения справедливой стоимости зданий | 1 022 | 595 |
| Расход по отложенному налогу на прибыль от изменения справедливой стоимости зданий | (255) | (162) |
| *Прочий совокупный доход, подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах* | | |
| Переоценка инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 22 | (120) |
| За вычетом расходов от переоценки инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход, перенесенных в состав прибыли и убытка при выбытии | 31 | 66 |
| Резерв от обесценения инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | (157) | - |
| **Прочий совокупный доход за год** | **663** | **379** |
| **Итого совокупный доход за год** | **1 938** | **2 315** |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2018 ГОДА

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|
| **Денежные потоки от операционной деятельности** | | |
| Проценты полученные | 11 072 | 11 921 |
| Проценты уплаченные | (5 906) | (3 333) |
| Комиссионные доходы полученные | 5 250 | 2 296 |
| Комиссионные доходы уплаченные | (395) | (261) |
| Полученные доходы по операциям с иностранной валютой | 1 175 | 612 |
| Расходы на оплату труда | (6 700) | (6 865) |
| Прочие полученные доходы (включая погашение ранее списанных долгов) | 2 065 | 1 089 |
| Прочие уплаченные расходы | (4 158) | (3 601) |
| **Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах и уплаты налога на прибыль** | **2 403** | **1 858** |
| Чистое (увеличение)/уменьшение операционных активов | | |
| Средства в Национальном банке Республики Беларусь и кредитно-финансовых учреждениях | (1 242) | (4 901) |
| Кредиты клиентам | (64 046) | (10 917) |
| Прочие активы | 65 | (16) |
| Чистое увеличение/(уменьшение) операционных обязательств | | |
| Средства кредитно-финансовых организаций | 13 634 | (12 694) |
| Средства клиентов | 29 977 | 20 955 |
| Прочие обязательства | (85) | 642 |
| **Чистые денежные потоки от операционной деятельности до налога на прибыль** | **(19 294)** | **(5 073)** |
| Уплаченный налог на прибыль | (242) | (328) |
| **Чистое расходование денежных средств от операционной деятельности** | **(19 536)** | **(5 401)** |
| **Денежные потоки от инвестиционной деятельности** | | |
| Продажа инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 61 196 | 504 642 |
| Покупка инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | (60 417) | (497 475) |
| Поступления от выбытия основных средств и нематериальных активов | 169 | 11 |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | (477) | (1 254) |
| **Чистое поступление денежных средств от инвестиционной деятельности** | **471** | **5 924** |
| **Денежные потоки от финансовой деятельности** | | |
| Выпуск собственных облигаций | 142 028 | 22 704 |
| Погашение собственных облигаций | (127 652) | (16 988) |
| **Чистое поступление денежных средств от финансовой деятельности** | **14 376** | **5 716** |
| Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты | 764 | 532 |
| **Изменение денежных средств и их эквивалентов** | **(3 925)** | **6 771** |
| **Денежные средства и их эквиваленты, на начало года** | **26 039** | **19 268** |
| **Денежные средства и их эквиваленты (до вычета резерва), на конец года** | **22 114** | **26 039** |

Доронкевич А. В. — Председатель Правления

Ковалева Т. Н. — Главный бухгалтер

14 мая 2019 года
г. Минск

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2018 ГОДА

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Примечания | Акционерный капитал | Фонд переоценки основных средств | Фонд переоценки инвестиционных ценных бумаг | Накопленный убыток | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **31 декабря 2016 года** | | **45 318** | **3 821** | **(10)** | **(7 678)** | **41 451** |
| Совокупный доход за период | | - | 433 | (54) | 1 936 | 2 315 |
| **31 декабря 2017 года** | | **45 318** | **4 254** | **(64)** | **(5 742)** | **43 766** |
| Влияние перехода на МСФО 9 по состоянию на 1 января 2018 года | 3 | | | 174 | (1 209) | **(1 035)** |
| **Совокупный доход за период** | | - | 767 | (104) | 1 275 | **1 938** |
| **31 декабря 2018 года** | | **45 318** | **5 021** | **6** | **(5 676)** | **44 669** |

**Иностранное унитарное предприятие «Делойт и Туш»**

ул. К. Цеткин, 51А, 13-й этаж,
Минск, 220004,
Республика Беларусь.
Тел.: +375 (17) 309 99 00
Факс: +375 (17) 309 99 01
deloitte.by

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ПУБЛИКУЕМОЙ ОБОБЩЕННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Акционерам, Совету директоров и Правлению Закрытого акционерного общества «БТА Банк»

**Мнение**

Публикуемая обобщенная финансовая отчетность Закрытого акционерного общества «БТА Банк» (далее — «Банк») (место нахождения: 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20-2, дата государственной регистрации: 25 июля 2002 года, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 807000071), состоящая из отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2018 года, отчета о совокупном доходе, отчета об изменении собственного капитала и отчета о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2018 года, составлена на основе проаудированной финансовой отчетности Банка за 2018 год.

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая обобщенная финансовая отчетность согласуется во всех существенных аспектах с проаудированной финансовой отчетностью в соответствии с Инструкцией «О раскрытии информации о деятельности банка, открытого акционерного общества «Банк Развития Республики Беларусь», небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга», утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года (далее — «Инструкция № 19»).

**Публикуемая обобщенная финансовая отчетность**

В публикуемой обобщенной финансовой отчетности не содержится вся необходимая информация, подлежащая раскрытию в финансовой отчетности в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности. Поэтому ознакомление с публикуемой обобщенной финансовой отчетностью и аудиторским заключением по данной отчетности не заменяет ознакомление с проаудированной финансовой отчетностью и аудиторским заключением по данной отчетности, которая была размещена в полном объеме на сайте Банка www.btabank.by. Финансовая отчетность и публикуемая обобщенная финансовая отчетность не отражают влияния событий, произошедших после даты нашего аудиторского заключения по финансовой отчетности.

**Проаудированная финансовая отчетность и аудиторское заключение по данной отчетности**

Мы выразили немодифицированное аудиторское мнение о проаудированной финансовой отчетности в нашем заключении от 14 мая 2019 года. Заключение также включает информацию о ключевых вопросах аудита. Ключевые вопросы аудита — это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита финансовой отчетности за отчетный период.

**Ответственность руководства за публикуемую обобщенную финансовую отчетность**

Руководство Банка отвечает за подготовку данной публикуемой обобщенной финансовой отчетности на основе проаудированной финансовой отчетности в соответствии с Инструкцией № 19.

**Ответственность аудитора**

Наша ответственность заключается в выражении мнения о том, согласуется ли во всех существенных аспектах публикуемая обобщенная финансовая отчетность с проаудированной финансовой отчетностью. Мнение выражено на основании процедур, проведенных в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности и Международными стандартами аудита.

14 мая 2019 года
г. Минск

Заместитель генерального директора по качеству в аудиторской деятельности Иностранное унитарное аудиторское предприятие «Делойт и Туш»

Д. А. Бекешко
Квалификационный аттестат аудитора № 0002114 от 27 июня 2013 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь

Начальник департамента аудита Иностранное унитарное аудиторское предприятие «Делойт и Туш»

М. И. Шаченкова
Квалификационный аттестат аудитора № 0002335 от 23 декабря 2015 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь

**Информация об аудиторской организации**

Наименование:
Иностранное унитарное аудиторское предприятие «Делойт и Туш»

Место нахождения:
ул. К. Цеткин, 51а, 220004, г. Минск, Республика Беларусь

Свидетельство о государственной регистрации, выданное на основании решения МИД Республики Беларусь от 3 марта 2014 года, № 0098185, УНП 101518377

*Наименование «Делойт» относится к одному либо любому количеству юридических лиц, включая их аффилированные лица, совместно входящих в «Делойт Туш Томацу Лимитед», частную компанию с ответственностью участников в гарантированных ими пределах, зарегистрированную в соответствии с законодательством Великобритании (далее — ДТТЛ). Каждое такое юридическое лицо является самостоятельным и независимым юридическим лицом. ДТТЛ (также именуемая «международная сеть «Делойт») не предоставляет услуги клиентам напрямую. Подробная информация о юридической структуре ДТТЛ и входящих в нее юридических лиц представлена на сайте www.deloitte.com/about.*
*© 2019 Иностранное унитарное предприятие «Делойт и Туш». Все права защищены.*

ООО «Расантехторг» (организатор аукциона) проводит 01.08.2019 г. повторные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества СООО «ПОЛИФАС» (продавец)

| Лот № | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сведения о предмете электронных торгов | Ангар с металлоконструкцией (цельнометаллический) | Ангар с металлоконструкцией (цельнометаллический) | Универсальная стеллажная система | Водоохлаждающая холодильная машина TAG561/CB26-16 | Доп. оборудование для производства трубок/жгута для экструзионной линии | Агломератор полимеров АПР-2 |
| Начальная цена предмета торгов, без НДС | 109 900,00 | 109 900,00 | 18 690,00 | 3 640,00 | 30 800,00 | 3 080,00 |
| Шаг аукциона 5 % | 5 495,00 | 5 495,00 | 934,50 | 182,00 | 1 540,00 | 154,00 |
| Сумма задатка 10 % | 10 990,00 | 10 990,00 | 1 869,00 | 364,00 | 3 080,00 | 308,00 |
| Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с организацией торгов | 100,00 | 100,00 | 70,00 | 60,00 | 80,00 | 50,00 |
| Местонахождение предмета торгов | 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 9. | | | | | |
| Р/с для перечисления суммы задатка | BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793 | | | | | |

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги) будут проведены 01.08.2019 г. в 9.00, на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание – 01.08.2019 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить (8-029) 6703084, WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лотам: продавец СООО «ПОЛИФАС», в лице управляющего по банкротству ООО «Агентство по антикризисному управлению» Павлович Андрей Георгиевич, тел. (8-029) 6824317. Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг» — WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10 % по каждому лоту принимаются по 29.07.2019 г.

**ООО «Расантехторг» (организатор аукциона) проводит 15.08.2019 г. торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества ООО «ГАРАНТСЕРВИСЦЕНТР» (продавец)**

Сведения о предмете электронных торгов: транспортное средство IVECO DAILY 35C15, тип ТС — грузовой фургон, кузов (VIN) ZCFC35A8075656585, 2007 года выпуска, регистрационный знак АН 1324 -5.
Дата проведения электронных торгов: 15.08.2019 года.
Место нахождения предметов электронных торгов: Минский р-н, пос. Сеница, ул. Коммунальная, д. 16, ДРСУ-735.
Начальная цена предмета электронных торгов: 12 800 руб. 00 коп., без НДС.
Шаг аукциона: 5 % — 640 руб. 00 коп.
Сумма задатка: 10 % — 1 280 руб. 00 коп.
Срок экспозиции: 30 календарных дней.
Сумма затрат Поверенного по организации и проведению электронных торгов: 70 руб. 00 коп.
Расчетный счет для перечисления суммы задатка: BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793.

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги) будут проведены 15.08.2019 г. в 9.00, на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание – 15.08.2019 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить (8-029) 6703084, WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лотам: продавец ООО "ГАРАНТСЕРВИСЦЕНТР", в лице управляющего по банкротству ООО «АСЕССОР», директор Яндовский Александр Александрович, тел. (8-029) 5691972. Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг» — WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10 % по каждому лоту принимаются по 12.08.2019 г.

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

# ПЕСНІ, ПТУШКІ, СУСЕДЗІ

ЗАЛЕССЕ, ПРУЖАНСКІ РАЁН




## або Аграсядзіба, якая не дае паміраць вёсцы

**Як жа прыемна бывае: заехаць, здаецца, на край зямлі, у куток паміж лясамі і балотамі, дзе ў маленькай вёсачцы засталася адзіная карэнная жыхарка, і ўпэўніцца, што нашу газету ведаюць і чытаюць. У 82-гадовай Марыі Лук'янаўны Сіплівай на тумбачцы цэлы стос газет, сярод якіх і «Звязда». Аказваецца, дачка выпісвае, часта маці прывозіць нешта цікавае пачытаць. Сама пенсіянерка таксама выпісвае тры выданні, потым дзеліцца з дачкой. Такі вось абмен інфармацыяй. Адзіны сусед бабулі Мані, гаспадар тутэйшай аграсядзібы Сяргей Сідарук сказаў: «Анатоль Кляшчук здымаў наш палявы савіны лагер, так што, можна сказаць, на старонках «Звязды» бывалі».**


Марыя СІПЛІВАЯ.

### РОДНЫ КУТ

Марыя Лук'янаўна нарадзілася тут, у Залессі, у 1937 годзе. Калі пачалася вайна, ёй ішоў чацвёрты год. Першы ўспамін дзяцінства — як ехалі з бацькамі на падводзе з клункамі, скрынямі. Выязджалі з вёскі, а дарослыя азіраліся і плакалі, бо хаты гарэлі. Тады не разумела, што робіцца, потым з расказаў бацькоў даведалася пра вясковую бяду. Залессе стаіць у лесе, побач Белавежская пушча. Жыхароў акупацыйныя ўлады адсюль высялялі прымусова. Вось і ім паступіў загад да такога і такога дня выехаць з сем'ямі і пажыткамі ў іншае месца. Вядома, людзі спадзяваліся на лепшае, думалі, можа, вайна скончыцца, што-небудзь памяняецца, вернуцца ў свае мясціны. Але як толькі выехалі на дарогу, хаты запалалі. Карны атрад сваю работу ведаў, праводзіў зачыстку лясных угоддзяў, падораных Герынгу, старанна. Яшчэ, відаць, баяліся чужынцы, што ў гэтых пустых вёсках могуць пасяліцца партызаны. І вёскі палілі датла.

Людзі з Залесся выехалі аж у Ваўкавыскі раён. Там і перабылі ўсю вайну. Потым сталі раз'язджацца хто куды. Некаторыя вярталіся ў родныя мясціны, будавалі жытло наноў, нехта рызыкаваў пашукаць шчасця ў іншых мясцовасцях. Так і бацька Марыі Лук'ян павёз сям'ю ў Літву. Там яна пайшла ў школу, пражылі ў літоўскай вёсцы каля 10 гадоў, а потым, калі сталі арганізоўваць калгасы, бацькі прынялі рашэнне вяртацца на радзіму. Усё роўна цягнула на бацькаўшчыну — так цяпер лічыць сталая жыхарка Залесся. Прыехалі, паставілі хату, сталі жыць. Тут Марыя ў 18 гадоў выйшла замуж. Праўда, і яны з маладым мужам адзін час падаліся ў Мінск, працавалі там, думалі стаць гараджанамі. А потым неяк у адзін дзень сабралі рэчы і прыехалі ў сваю вёску, з часам пабудавалі хату, у якой яна жыве і цяпер. У гэтай хаце з мужам выгадавалі дзвюх дачок. Цяпер у яе не толькі праўнукі, ужо і прапраўнучка ёсць. Але ўжо 25 гадоў, як Марыя Лук'янаўна адна: муж хварэў на сэрца, вось і пакінуў яе рана ўдавой. Працавалі на калгаснай ферме, як і ўсе ў гэтай вёсцы. Ферма была, значыць, і работа была.

Змалку рабіла з маці на калгасных палях. Згадала раптам, як падлеткам дапамагала маці садзіць кукурузу квадратна-гнездавым спосабам. У полі была як сябе помніць. А потым, дарослай ужо, пайшла даяркай, муж глядзеў цялят, летам пасвіў іх. Трэба было ж яшчэ сваю гаспадарку дагледзець, значыць, накасіць травы на ферму і частку яе — для сваіх дзвюх кароў. Таму Марыя, закончыўшы ранішнюю дойку, бегла ў поле пасвіць цялят, а гаспадар ішоў касіць. І так ледзь не ўсё лета. Але тады ўсё паспявалі, цяжкай гэта работа асабліва не здавалася, так усе жылі.

### АДНА НА ЎСЁ СЯЛО

Цяпер яна засталася адна з вяскоўцаў. Праўда, дочкі, адна з якіх жыве ў райцэнтры, другая ў іншай вёсцы, прыязджаюць часта. У доме ўсё зробяць, зімой і дроў, і вады наносяць, застаецца толькі ў хаце сваю няхітрую гаспадарку справіць. Калі б не сусед, які з'явіўся з адкрыццём аграсядзібы, дзеці ўжо ўгаварылі б Марыю Лук'янаўну пераехаць да іх, лічыць старшыня Велікасельскага выканкама Таццяна Навіцкая. А так яна ўжо як быццам не адна, людзі побач. У сядзібу часта госці прыязджаюць.

Яшчэ да нядаўняга часу было ў Залессі дзве пастаянныя жыхаркі: баба Маня і баба Валя. Ды траўма Марыі стала прычынай ад'езду суседкі Валянціны.

Летась Марыя Лук'янаўна аступілася і атрымала пералом нагі. Зразумела, было доўгае лячэнне, косці ў гэтым узросце зрастаюцца павольна. На час лячэння, вядома, дзеці яе не пакінулі адну ў хаце, забралі ў гарадскую кватэру. Суседка не захацела быць адна, таксама з'ехала да дзяцей у Кобрын, ды і засталася там. А Марыя Лук'янаўна перазімавала ў гарадскіх выгодах і вярнулася ў родную хату.

Цяпер яна чытае газеты, глядзіць тэлевізар, чакае родных і сваіх суседзяў, якія сталі нібы сваякі. Кажа: «У мяне ўсё ёсць, што трэба. Аўтакрама два разы ў тыдзень прыходзіць. І такія ўжо добрыя ў нас і прадавец, і вадзіцель, каб вы ведалі. У хату самі прыйдуць, усё прынясуць. А калі выйду па пакупкі, то і правядуць, і падтрымаюць. Прывозіць той аўтамагазін усё чыста, што толькі душа пажадае. Паштальён раз на тыдзень газеты прывозіць, мы так дамовіліся, не ездзіць жа штодня да мяне адной. А я тады газеты паступова чытаю, — працягвае пенсіянерка. — А ранічкай да мяне Сяргей альбо Насця (суседзі. — *Аўт.*) зазіраюць: як я тут, як маё здароўе, пацікавяцца. О, яны добра мяне глядзяць. Сярожа і вады, калі трэба, прынясе. А зімой, бывае, я яшчэ сплю, ён ужо снег да хаты прачысціць. Вось шкарпэтачкі ім калі звяжу альбо нават гасцям іхнім падару».

### ЗАПАТРАБАВАНЫЯ ПЕСНІ

У свае 82 гады Марыя Лук'янаўна вяжа нават без акуляраў. Ходзіць яна з кіёчкам, але нешта стараецца рабіць на агародзе, словам, без справы не сядзіць.

Даведаўшыся ад старшыні сельскага Савета пра вакальныя здольнасці Марыі Лук'янаўны, задаю пытанне пра песні. Яна спачатку сарамліва адмахваецца, потым шчыра ўсміхаецца: «Вой, цяпер у кожным інтэрнэце нашы з Валяй песні. Знаходзяцца аматары тут запісаць нас, а потым у той самы інтэрнэт і памяшчаюць», — гэта яна пра сваіх суседзяў — гаспадароў аграсядзібы.

Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады Таццяны Навіцкай, менавіта брастаўчане не далі канчаткова зачахнуць вёсцы з характэрнай назвай Залессе. У свой час гэтыя прыгожыя мясціны на ўскрайку вядомага балота Дзікое прыкмеціў Сяргей Сідарук з Брэста, купіў тут хату і пачаў абжывацца. Так з'явілася аграсядзіба «Залессе». Пазней гаспадары купілі яшчэ адну, суседнюю, хату. Цяпер у іх адзін дом жылы, што выкарыстоўваецца для сваёй сям'і, другі — гасцявы. Сяргей і Насця гадуюць дваіх дзяцей, якіх возяць у садок у вёску Клепачы, гэта кіламетраў восем адсюль. Гаспадар займаецца прыёмам гасцей, экалагічнымі і адукацыйнымі праектамі. Гаспадыня — фалькларыст, музыкант, робіць аранжыроўку песень, выступае на канцэртах у тым ліку з песнямі сваіх аднасяльчанак.

— Калі мы прыехалі сюды, — згадвае Сяргей Аляксандравіч — бабулі ўжо не спявалі, яны крыху прызабыліся свае песні. Мы сумелі іх угаварыць, падбухторылі згадаць песні сваёй маладосці. І яны, як той казаў, расталі. Успомнілі тыя, якія спявалі іх маці і бабулі. І працэс пайшоў. І ведаеце, ёсць даволі цікавыя песні. Некаторыя Насця выконвае на канцэртах, яна выступае ў групе «Крыві», іншых гуртах.

### СВЯТЫ Ў СЯДЗІБЕ

Так што праўду казала Марыя Лук'янаўна, што песні можна знайсці «ва ўсіх інтэрнэтах», прычым як іх аўтэнтычны варыянт, так і прафесійнае выкананне. Але залескія песні жывуць. А яшчэ дзякуючы Сідарукам музыку ў Залессі часам можна пачуць не толькі ў інтэрнэце. Тут праходзяць фестывалі, апошнім часам былі святы «Гуканне вясны», «Купалле». Некалькі гадоў таму прайшло даволі вялікае мерапрыемства пад назвай «Прызба-фэст». Так што сядзіба час ад часу становіцца цэнтрам маштабных імпрэз з удзелам нават соцень людзей.

Пра што, дарэчы, баба Маня расказвала так: «Што тут рабілася: аўтобусы стаялі, і міліцыя, і «хуткая», а людзей колькі было, з розных краін нават!» Гэта менавіта «Прызбу-фэст» яна згадала, але сціпла прамаўчала, што яна там была адной з зорак, бо выступіла з песняй, якую публіка ўспрыняла вельмі нават прыязна. А яшчэ Залессе праславілася правядзеннем савіных лагераў, калі сюды прыязджалі арнітолагі і аматары жывой прыроды з розных краін назіраць за птушкамі. Балота Дзікое многія ведаюць як тэрыторыю пражывання вяртлявай чаротаўкі. Цяпер дзякуючы гучным экалагічным мерапрыемствам пад эгідай «Залесся» яго сталі ведаць як месца пасялення барадатай кугакаўкі. Адзін з такіх савіных лагераў і здымаў калега Анатоль Кляшчук («Звязда» за 2 красавіка 2014 г. — *Аўт.*).

### НОВЫЯ ПРАЕКТЫ

Аграсядзіба развіваецца, праводзіць новыя праекты, сустракае новых гасцей. А побач з'явілася яшчэ адна. Дзве суседнія хаты набыла Наталля Грыцко з Брэста і ўладкоўвае тут яшчэ адну сядзібу, якая спецыялізуецца на вырабе чорнаглянцавай керамікі. У іх і падворак аздоблены адпаведным чынам. Праходзілі пленэры майстроў керамікі. Праўда, Грыцко бываюць тут наездамі, а Сідарукі жывуць пастаянна.

Цяпер яны ўсе разам думаюць, як прыцягнуць даволі папулярны ў Польшчы турыстычны маршрут «Белы бусел», які праходзіць па той бок граніцы. Тут жа граніца зусім побач: калі ўладкаваць яшчэ адну нітку маршрута, захапіць цікавінкі балот Дзікое і Шарашова — мястэчка на былым каралеўскім тракце — можа атрымацца даволі захапляльнае падарожжа.

Старшыня сельскага Савета ганарыцца, што на іх тэрыторыі функцыянуюць такія самабытныя аграсядзібы, якія займаюцца экалагічнай, асветніцкай і культурніцкай работай:

«Цікавыя людзі, яны пакінулі горад, перасяліліся ў аддаленую вёску, не ўсе іх разумеюць. Мне аднойчы Сяргей сказаў, што і ў нас некалі надыдзе мода на пражыванне бліжэй да прыроды. Толькі баюся, што не скора прыйдзе гэты час...» — заўважыла Таццяна Навіцкая.

А на маё пытанне, ці не шкада яму выгод цывілізацыі, ад якіх адмовіўся, Сяргей Сідарук сказаў так: «Цяпер, калі цывілізацыя перамясцілася ў інтэрнэт, шкадаваць няма чаго. А тут наогул самае лепшае месца».

Вось так і Марыя Сіплівая лічыць, што Залессе — месца самае лепшае на свеце, таму і не едзе нікуды.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Памяць

# САЎІНФАРМБЮРО АНЛАЙН

**Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць вяртаць імёны, знаходзіць звесткі пра блізкіх, якія прапалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, збіраць даследчыкам інфармацыю пра падзеі таго часу. Сёння, каб папрацаваць з ваеннымі дакументамі, якія захоўваюцца ў Расіі, зусім не абавязкова ехаць да суседзяў.**

Расійская Прэзідэнцкая бібліятэка, якая размяшчаецца ў Санкт-Пецярбургу, прапануе пазнаёміцца з унікальнымі дакументамі, фатаграфіямі, відэаматэрыяламі, што распавядаюць пра другую сусветную вайну, на партале арганізацыі ў калекцыі «Памяць аб Вялікай Перамозе». У электронную калекцыю ўключаны афіцыйныя дакументы, фота і кінахроніка, газеты ваеннага часу, кнігі, біяграфіі, сведчанні ўдзельнікаў баявых падзей, іх дакументы. У тым ліку тут можна знайсці дакументы, якія расказваюць пра аперацыю «Баграціён».

22 чэрвеня 1944 года Чырвоная Армія правяла разведку боем, а на наступны дзень пачалася знакамітая аперацыя. Пра тое, што адбывалася ў тыя дні, сведчаць звесткі Савецкага інфармбюро, зборнік якіх даступны на вышэйзгаданым партале. Ужо 27 чэрвеня 1944 года паведамлялася: «Паўднёва-заходней горада Віцебск нашы войскі завяршылі ліквідацыю акружанай групоўкі праціўніка... З прычыны адчайнага супраціўлення большая частка акружаных нямецкіх войскаў была перабітая нашымі войскамі; пры гэтым праціўнік пакінуў на полі боя больш за 20 000 трупаў. Рэшткі гэтых дывізій прынялі ультыматум Савецкага камандавання аб капітуляцыі, скончылі супраціўленне і склалі зброю. Па папярэдніх даных, здалося ў палон звыш 10 000 нямецкіх салдат і афіцэраў».

Шмат зводак ішло пра дзейнасць партызанаў, так Саўінфармбюро паведамляла: «Некалькі партызанскіх атрадаў, якія дзейнічаюць у Баранавіцкай вобласці, у маі пусцілі пад адхон 27 нямецкіх воінскіх эшалонаў і ўзарвалі звыш 1000 рэек. Разбіта 25 паравозаў, 52 вагоны з войскамі і 120 вагонаў і платформаў з рознымі ваеннымі грузамі. Партызаны ўзарвалі 10 шасэйных мастоў і выразалі 19 кіламетраў тэлеграфна-тэлефоннай лініі сувязі. У баях з нямецкімі захопнікамі забіта 800 і паранена больш за 700 гітлераўцаў».

Таксама на партале можна знайсці лічбавыя копіі партызанскіх газет і даведацца з іх, якую работу вялі партызаны, каб не дазволіць ворагу, які адступаў, ператварыць беларускія землі ў пустыню. Па ўсёй тэрыторыі краіны ствараліся лясныя лагеры для мірных жыхароў, якія ахоўваліся партызанамі, таксама лясныя салдаты стараліся ўберагчы вёскі ад спаленняў, не дазволіць сагнаць людзей на прымусовыя работы ў Германію, вялі агітацыйную работу сярод насельніцтва.

**Падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

На экранах

# Хто монстр, а хто — ахвяра

## Уладальнік Залатой пальмавай галіны ідзе ў беларускім пракаце

**Фільм «Паразіты», які некалькімі жанрамі віртуозна, кур'ёзна, энергічна расказвае пра міжкласавую прорву і дае зразумець, што яна — не крыўдная данасць, а трагедыя, паказваецца ў кінатэатрах. Журы Канскага кінафестывалю, што прайшоў у маі, аддала карціне Залатую пальмавую галіну, чым ушанавала ныючую тэму, надзвычайна прадуманую драматургію і рэжысёрскую стройнасць вядомага ў Азіі аўтара Пон Чжун Хо.**

Для гледачоў тут у адным флаконе прызапашаны трапныя жарты, саспенс і драматызм — карціна мяняе жанры як пальчаткі, і тое, што пачынаецца камедыяй, працягваецца трылерам, потым трагедыяй, канчаецца драмай дарэмных надзей. За кошт структуры фільм выйграе бясспрэчна, і не толькі таму, што забаўляе гледача разнастайнасцю стыляў, але і таму, што транслюе няўстойлівасць і ненадзейнасць становішча, якое ствараецца ў грамадстве пры класавай няроўнасці. Да таго ж усе часткі Пон Чжун Хо спалучае ёмка і арганічна, так што ў кожную новую рэчаіснасць уліваешся лёгка і незаўважна.

Гісторыя разварочваецца вакол дзвюх сімпатычных сямей, беднай і багатай. У кожнай чатыры чалавекі — бацькі, дачка і сын, таму іх нельга не параўноўваць. Сям'я Кім Кі Тэка жыве ў падвальным памяшканні і зарабляе толькі тым, што даволі неахайна складвае з загатовак каробкі для піцы. Аднойчы сябар рэкамендуе Кі У, сына Кі Тэка, у якасці рэпетытара англійскай у багаты дом. Сястра падрабляе дыплом, бацька кажа: «Я ганаруся табой», — і Кі У першым трапляе ў сям'ю містара Пака. За сабой ён прыцягвае сястру як настаўніцу малявання, тая падстройвае звальненне кіроўцы і прапануе на яго месца свайго бацьку, нарэшце, яны разам псуюць вобраз хатняй работніцы, і гэтую пасаду праз пэўныя маніпуляцыі займае маці. Пакі не падазраюць, што іх катэдж занялі самазванцы, і з'язджаюць на пікнік, а Кімы арганізуюць сабе сямейную вечарыну ў шыкоўным гаспадарскім доме — з гэтага моманту пачынаецца трылер.

З развіццём падзей усё больш разумееш, што сімпатычных сем'яў тут не дзве і Кімы ў вобраз прастадушнай абяздоленай беднасці не ўпісваюцца. Дакладна не дурныя дачка з сынам з пэўных прычын не могуць трапіць у вышэйшую лігу: Кі У некалькі разоў паступаў ва ўніверсітэт, але ён там не вучыцца, Кі Джон мае свае таленты, але не можа іх скарыстаць. Развіццё герояў сутыкаецца з сацыяльнымі перашкодамі, таму сын не можа наняцца на работу без падробленага дыплома, а ўся сям'я не можа прасунуцца да сонца без падману і несумленных інтрыг.

«Паразіты» — а ў параўнанні з Пакамі Кімы выглядаюць татальнымі адмарозкамі — ператвараюцца ў гісторыю пра «натуральнага чалавека» Жан-Жака Русо, першапачаткова добрую прыроду якога псуе цывілізацыя, то-бок сацыяльныя ўмовы і няроўнасць. Пакі, пакуль іх дом займаюць маральныя монстры, дабрадушна купляюцца на кожны падман і абмяркоўваюць пах новага кіроўцы. Нефанабэрыстыя айцішнік, наіўная жонка, звычайныя дзеці процістаўляюцца выкрутлівай, сапсаванай і беспрынцыпнай сям'і Кімаў, карацей, багацце — беднасці.



Мы не бачым у Кімаў ніякіх згрызот сумлення нават пасля даволі жорсткіх учынкаў. А на што яны здольныя дзеля захавання сваіх мелкіх пазіцый абслугі, варта паглядзець: Пон Чжун Хо фіксуе гэтае здрабненне каштоўнасцяў і несуразмернасць паміж высілкамі і мэтамі. Па вялікім рахунку нязначныя пасады робяцца ў беднякоў з падвала нагодай не толькі для падману, але і фізічных распраў, чаго яны дакладна не вартыя.

Пераацэньванне звычайных рэчаў праз згаленне і нягоды было ўласціва і савецкаму чалавеку, калі бытавыя рэчы не набываліся, а «здабываліся», ад чаго і выраслі ў сваёй значнасці. Гэта ў цэлым непазбежна пры беднасці, пытанне толькі ў распаўсюджанасці: у Савецкім Саюзе, напрыклад, такая з'ява стала характарам эпохі, але назіраецца ў большай ці меншай ступені шмат дзе і ў сённяшняй Беларусі таксама. Таму нам добра зразумела, пра што кажа Пон Чжун Хо, прычым кажа з перасцярогай: маўляў, такія тэндэнцыі не проста адмоўныя ў культурным ці яшчэ якім сэнсе, але і небяспечныя.

Згодна з «Паразітамі», небяспека хаваецца як у сляпой карыслівасці і празе лепшага жыцця, так і ў натуральна ўзнікаючым проціпастаўленні багатых бедным: у фільме галоўнае злачынства здзяйсняецца ўсё ж не дзеля выгод, а з-за імпульсу, справакаванага абразлівай грэблівасцю да паху чалавека ніжэйшага класа. Персанаж, якога чапляе гэтае ненаўмыснае падкрэсліванне яго неадпаведнасці стандартам вышэйшага саслоўя, хаця б у такой дробязі, завяршае гісторыю трагедыяй.

Усё ж такі антыгерояў у Пон Чжун Хо няма: што Пакі, што Кімы з'яўляюцца ахвярамі, і ўсе — ахвярамі класавай няроўнасці. Тым больш рэжысёр нікога не ідэалізуе і пра сваіх багацеяў таксама выказваецца з пэўнай іроніяй — праз іх ахвочасць да ўсяго амерыканскага, непразорлівасць і круглую аблапошанасць. Як і Русо, шляхам параўнання дзвюх сем'яў і закручастым сюжэтам Пон Чжун Хо робіць галоўным антыгероем цывілізацыю, што сваёй несправядлівай асновай з «чыстага» чалавека фарміруе монстра.

Цудоўна, што і заканчваюцца «Паразіты» не злачынствам, то-бок пратакольнай канстатацыяй, маўляў, сацыяльная няроўнасць прыводзіць да трагедый, а жанравым пераключэннем на драму з кранальнымі марамі Кі У, якім, відаць, не збыцца. Ну а чаго хацець: што Жан-Жак Русо ў XVIII стагоддзі, што Пон Чжун Хо ў XXI — усё пра тое ж.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Кінакрокі

# «Марсельеза» на беларускім хутары

## Як рэпатрыянтка наведвала родны французскі горад

**У шаснаццацігадовым узросце іміgranцкая дачка беларускіх імігрантаў Жанін з французскага горада Лален разам з сям'ёй трапіла пад сталінскую кампанію па рэпатрыяцыі і пераехала ў Савецкі Саюз. У 1946 годзе дзяўчына апынулася на тэрыторыі Беларусі і пражыла тут усё жыццё, успамінаючы родны горадок, молячыся на французскай і спяваючы «Марсельезу». Але ж раптам у 88 гадоў Яніна Сташко атрымала магчымасць наведаць Лален і пераадолела дзеля гэтага 1700 кіламетраў. Слёзы, жарты, эмоцыі: пра савецкую рэпатрыянтку, яе ўспаміны, жыццё і вяртанне ў горад дзяцінства расказвае дакументальная стужка Уладзіміра Бокуна, якая так і называецца — «Жанін».**

Гэтага чуллівага візіту, напэўна, не было б, калі б не «спеўка» пасольства Францыі ў Беларусі і «Майстэрні Уладзіміра Бокуна», то-бок пасла і рэжысёра. Спадар Дзідзье Канэс падчас выканання сваёй дыпламатычнай місіі ў нашай краіне даведаўся пра савецкую рэпатрыяцыю і пачаў наносіць візіты былым грамадзянам Францыі, а некаторым нават выдаваць (вяртаць) французскія дакументы.

Ледзь не па ўсім свеце выхадцы з гэтых тэрыторый праз настойлівую агітацыю прадстаўнікоў адпаведных структур у таварных вагонах пераязджалі ў багаты і шчаслівы, як яны думалі, Савецкі Саюз. Некаторых пасля перасячэння граніцы адразу арыштоўвалі, некаторых не давозілі да родных гарадоў, некаторых прывозілі ў строга прызначаныя месцы, але ва ўсіх забіралі французскія пашпарты, так што вярнуцца ім было немагчыма. Па словах Яніны Сташко, яе маці пасля пераезду ў СССР пасівела літаральна за некалькі дзён.



Рэпатрыяцыя — адна з соцень трагічных хваляў, справакаваных савецкай уладай, і Жанін з'яўляецца не проста яе сведкай, але і ўдзельніцай (гледзячы на моцную галоўную гераіню, не хочацца казаць «ахвярай», але ў цэлым слова ў гэтым выпадку слушнае). Пра вяртанне савецкіх грамадзян на радзіму расказваюць і іншыя героі, у асноўным дзеці рэпатрыянтаў, але галоўнай вартасцю фільма застаецца, канешне, аптымістычная, жартаўлівая, стойкая Жанін. Надзвычайную гераіню гэтым разам кінематаграфісты знайшлі для свайго праекта — яна тут і фактура, і драматургія, і мантаж. Кадры, дзе ёсць Яніна Сташко, вартыя ўвагі ўжо самі па сабе.

**Некаторых пасля перасячэння граніцы адразу арыштоўвалі, некаторых не давозілі да родных гарадоў, некаторых прывозілі ў строга прызначаныя месцы, але ва ўсіх забіралі французскія пашпарты.**

Амаль што «грунтоўна» карціна асвятляе рэпатрыяцыю не толькі як гістарычную з'яву праз тых, хто аказаўся датычным да яе віроў, але і як маштабную драму праз яе прызнанне афіцыйнымі структурамі. Таму сюды ўключаны шматлікія эпізоды, дзе галоўнай дзеючай асобай становіцца Дзідзье Канэс, што наведвае рэпатрыянтаў і гутарыць з імі, запрашае іх у сваю рэзідэнцыю, перадае ім у рукі французскія пашпарты.



Хваля перасяленняў былых савецкіх грамадзян перастае быць рэччу ў сабе, непрызнаным непаразуменнем: яе ініцыятары, вядома ж, не мелі магчымасці прынесці свае прабачэнні, затое з'ява адгукаецца ў сучасных дзеячах. Крокі ў бок гарадскіх кватэр і хутарскіх дамоў рэпатрыянтаў, хоць у якасці хутчэй выключэння і здзейсненыя дыпламатам з замежжа, грэюць душу, паколькі ў цэлым ахвяры савецкіх пертурбацый для сённяшняга афіцыйнага дыскурсу, лічы, згубленыя.

Таму яшчэ больш выключнай і важнай выглядае арганізаваная спецыяльна для Жанін паездка ў Францыю, дзе яна нарадзілася і пражыла амаль сямнаццаць гадоў. Тут яе сустрэлі ў музеі, каб паказаць адмысловую кнігу, у якой зарэгістраваны колішні прыезд у Лален яе бацькоў, і запрасілі ў мэрыю, дзе ўзнагародзілі памятным медалём, але што найбольш прыгожа і ўзрушальна — правялі да дома, дзе яна некалі жыла, звадзілі на святую імшу ў родным касцёле і сустрэлі ў школе, у якой Жанін некалі вучылася. Уласна да гэтых момантаў і рыхтуе перадгісторыя, уласна тут і разумееш бязлітаснасць савецкай улады.

Тым не менш карціна асабліва не абцяжарвае: жывая, неакадэмічная, «ліберальная» манера здымак суправаджае ў свет Яніны Сташко з яе сабакамі Трампам і Абамам, а праз аптымізм галоўнай гераіні ўсе нягоды неяк страчваюць у вазе.

Вось я ўсё і расказала! Прэм'ера фільма адбылася ў Falcon Club Буцік Кіно 10 ліпеня — на яе прыязджалі сама Яніна Сташко, якая падзякавала і за фільм, і за падарожжа, яе сын, дзеці рэпатрыянтаў і Дзідзье Канэс. Сёння, 13 ліпеня, карціна «Жанін» будзе паказана на тэлеканале АНТ.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**



Прэм'ера

# Сімвалы і алегорыі «Шляхціца Завальні»

## Купалаўскі нагадвае пра пачуццё нацыянальнай годнасці

**На сцэне апынуліся ваўкалак, цмок і Белая Сарока, а размова пайшла пра нацыянальную адметнасць, праз якую Беларусь захоўвае не толькі выключнасць, але і незалежнасць, — у Купалаўскім тэатры адбылася прэм'ера спектакля «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Мазаіка з матываў, скокаў і перакручаных сюжэтаў Яна Баршчэўскага шле гледачам даволі літаральныя мэсэджы аб краіне, гісторыі і культурнай адметнасці, а Купалаўскі займаецца тым, чым і павінен займацца нацыянальны тэатр, — патакае пачуццю ўласнай годнасці.**

Зварот да Яна Баршчэўскага, сімвалічнай для нацыянальнай культуры персоны, ніколі не будзе дарэмным, але гэтым разам ён з'явіўся ў рэпертуары Купалаўскага надзвычай своечасова. Кніга, што апела народны фальклор, унікальныя мясцовыя міфы, беларускую глыбінку і праз вобраз Белай Сарокі паказала замахі чужых культур, увасабляецца ў тэатральнай пастаноўцы якраз у час актыўнага абмеркавання нацыянальнай адметнасці на фоне інтэграцыйных працэсаў.

**Пад месяцам ды ў кшаках, з кпінамі Шэльмера ды фанабэрыстасцю Белай Сарокі адбываецца самае галоўнае — самаўсведамленне беларусаў.**

І не проста ўвасабляецца, але і перакройваецца да яшчэ больш недвухсэнсоўных пасылаў: у адрозненне ад сярэдзіны XIX стагоддзя нам ужо не трэба вылучаць наяўнасць беларускай гісторыі і самабытнай культуры, але рабіць іх гарантам незалежнасці і апеляваць да нацыянальнага самаўсведамлення, ды яшчэ на адной з галоўных тэатральных сцэн, усё яшчэ неабходна.

З-за сваёй своечасовасці «Шляхціц Завальня» (нават крыху нязграбны: то занадта манерны, то напышлівы, то лішні) гучыць галасней, падкрэслівае тлусцей і адгукаецца глыбей. Пастаноўка, хоць яе назва і паўтарае слова ў слова назву зборніка, бязлітасна пераварочвае Баршчэўскага з ног на галаву і перакрыжоўвае ў сабе некалькі сюжэтаў.

**З-за сваёй своечасовасці «Шляхціц Завальня», нават крыху нязграбны — то занадта манерны, то напышлівы, то лішні, гучыць галасней, падкрэслівае тлусцей і адгукаецца глыбей.**

Да шляхціца Завальні з Санкт-Пецярбурга прыязджае ўнук Ян і даведваецца, што сяброўка дзяцінства Амелія выйшла замуж за іх агульнага сябра Альберта. У гэты час у Альберта гасцюе еўрапеец доктар Шэльмер, што насамрэч з'яўляецца чарнакніжнікам і служыцелем Белай Сарокі. Паралельна развіваецца гісторыя карыслівай Агапкі і закаханага ў яе Карпы, якія гатовы прадаць душу за цмока, што здабываў бы для іх сямейнага саюзу золата і срэбра.

Рэжысёр Алена Ганум такім чынам знаходзіць месца для рамантычнай гісторыі з любоўным трохкутнікам, прыгодамі і выратаваннем; для вярбоўкі на служэнне Белай Сароцы (у Баршчэўскага яна была алегорыяй Кацярыны II) з гістарычным падтэкстам і адсылкай да сучаснасці; для той самай унікальнай беларускай культуры, якую сімвалізуюць невыпадковыя фальклорныя сюжэты з ваўкалакамі, цмокамі і замоўленымі скарбамі.

У складаназлучаны сюжэт упісаны неабходнасць абараняць свой край, наўпроставыя размовы пра ліцвінаў/беларусаў і абразлівыя кпіны з наіўных вераванняў дурных прасталюдзінаў. Апошняе, што важна, сыходзіць ад доктара Шэльмера, то-бок прадстаўніка замежжа. Усё гэта — неўсвядомленае, непрызнанае, прыбітае — паказваецца ў паўмістычнай атмасферы (афармленне вянчае вялізная галава пеўня, вока якому замяняе месяц), дзе галоўную небяспеку нясуць замежныя прозвішчы і ўтрыраваны акцэнт (вядома ж, не самі па сабе, а праз свае нядобрыя намеры).

Пад месяцам ды ў хмызняках, з кпінамі Шэльмера ды фанабэрыстасцю Белай Сарокі (апранутай насамрэч у чорнае) адбываецца самае галоўнае — самаўсведамленне беларусаў. Аўтары, канешне, чаго толькі ў спектаклі не намясілі. Ненатуральныя сантыменты і пяшчотныя галасы рамантычнай лініі ў атачэнні прыгожа фантастычных падзей выглядаюць данінай глядацкім чаканням; танцы, якіх у пастаноўцы даволі, часам толькі расцягваюць час — то абыгрываюцца, то не абыгрываюцца (і ў рэшце рэшт надакучваюць); гумарыстычны эпізод з Завальняй, які лёг паміраць, але ажыў з-за дастаўленай індыйскай трубкі і танца сланоў ізноў вытыркаецца з адзіна вартай таямнічай эстэтыкі, тон якой задае галава пеўня.

Галоўнае — прыгожыя сімвалы самабытнасці і шырыні нацыянальнай культуры — у пэўным сэнсе нівелююцца скокамі і няўдалым спалучэннем гісторый і настрояў, але ўсё ж такі пануе. У пэўны момант сюжэтныя лініі спектакля, што ўвесь час падганяюцца нячыстай сілай, сыходзяцца ў адным пункце і вырашаюцца нечым надзвычайным, вышэйшым нават за цёмныя заклінанні, чарнакніжніка і Белую Сароку. Плачкі — яго ўвасабленне — з'яўляюцца ў белых, доўгіх, незямных строях. Так што пакуль яны ёсць — Плачкі, міфы, фальклор, літаратура, выяўленчае мастацтва, тэатр, то-бок беларуская культура ў цэлым, нам за сябе можна не хвалявацца.

Тэматычная селекцыя Купалаўскага ў гэтым выпадку заслугоўвае апладысментаў, хоць, можа, выкананне задумы і не дацягвае да яе высакародных сэнсаў. Так і сядзіць беларус у тэатральнай зале — з мастацкай другараднасцю, затое з патрыятычным уздымам.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
**Фота прадстаўлена Купалаўскім тэатрам.**

На сцэне

# «Калхознік» усіх перамог

## Прыватны выпадак выкарыстання савецкай сістэмы

**Усё пачынаецца з Высоцкага, які памёр. Новая пастаноўка Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Сірожа» без асаблівай эканоміі часу актыўна карыстаецца відэаархівамі, што адлюстроўваюць эпоху — пачатак 1980-х — і адбіваюць такт у аповедзе пра пяцярых студэнтаў. Брэжнеўскае кіраванне, смерць Высоцкага, пахаванне Машэрава, «інтэрнацыянальны доўг» у Афганістане, Алімпійскія гульні — што гэта за часы і якіх людзей яны прывучаюць? У інтэрнатным пакоі здараюцца сваркі, бойкі, каханне, вечарыны і надрыўныя драмы, што вызначаць усё далейшае жыццё герояў. Пройдзе трыццаць два гады, і мы бычцам бы ўбачым, хто пераможа, а хто з іх — прайграў.**

Яўрэю Мішу прарочаць Нобелеўскую прэмію па матэматыцы, Макс — весялун і прапойца, моднік Кракадайл крытыкуе ўлады і займаецца медытацыямі. З імі ўвесь час тусуецца прыгажуня і дачка высокапастаўленага «служыцеля народа» Дзіна. Пара тыдняў прайшла з пахавання Уладзіміра Высоцкага, у пакоі пануе меланхолія, сябры размаўляюць амаль механічна — і ў гэты густы свет, што віхар, урываецца вясковы хлопец Сяргей, нязграбны, працецкі, шэры, які размаўляе на трасянцы і не ведае пра пачуццё такту.

Хлопца суправаджае дзядзька Пеця — былы франтавік, а зараз старшыня калгаса. Ужо з першых сцэн мы бачым праяўленні канфлікту нават не пакаленняў, дзе можна было б спаслацца на розны досвед: «Сірожа» паказвае незалежную ад узросту рознасць паміж савецкім чалавекам і тым, хто знаходзіцца ў цвярозай апазіцыі афіцыйнай рыторыцы. Кожны з герояў спектакля, пастаўленага Аляксандрам Гарцуевым паводле Юліі Чарняўскай, вызначаецца ў тым ліку сваімі стасункамі з дзяржавай: нехта ад яе бяжыць, нехта ігнаруе, нехта ставіцца са скепсісам, і толькі адзін малады чалавек іграе па яе правілах. Менавіта сістэма дае разгуляцца нізкім парывам і самаўладна мяняць жыцці, а ў тых, каго яна непасрэдна не датыкнулася, так ці інакш пакідае невытлумачальны сум.

**«Сірожа» паказвае незалежную ад узросту рознасць паміж савецкім чалавекам і тым, хто знаходзіцца ў цвярозай апазіцыі афіцыйнай рыторыцы.**

Усё, што тут ёсць і адбываецца, паказвае эпоху: яе быт праз партрэт Ясеніна ці дыванок на сцяне, жалезныя ложкі, касетны прайгравальнік, бутэлькі гарэлкі, вывешаныя за акно прадукты з-за адсутнасці лядоўняў, джынсы ад фарцоўшчыка і «Листья жёлтые по городу кружатся»; і яе характар праз погляды, каштоўнасці і магчымасці (альбо іх адсутнасць). Формулу ж яе мімалётам агучыў камендант інтэрната: «Павінен быць парадак, нават калі па факце бардак», — бачыш адно, а бяры і запісвай, як патрабуецца. Ён жа — шматзначныя водгаласы мінулага раз-пораз праскокваюць у дыялогах — увесь час агаворваецца, называючы 406-ы пакой камерай.

Паміж героямі тут праводзіцца відавочная раздзяляльная лінія: для адных вайна ў Афганістане з'яўляецца інтэрнацыянальным доўгам, для іншых — увядзеннем войскаў на тэрыторыю чужой краіны; для першых Сталін — гэта парадак, для другіх — лагеры; Мандэльштам можа быць сімвалам несправядлівай карнай сістэмы, а можа — Мандэльштампам. Той, хто асуджае афганскую кампанію, трапіць на вайну і атрымае раненне, а той, хто яе вітае і ўхваляе, возьме і на яе «адправіць». Сірожа — увасабленне гэтага зручнага «новага» чалавека (ну, новага прынамсі для першых дзесяцігоддзяў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі), які мысліць шаблонамі, прымае навязаныя ўстаноўкі, паўтарае за прапагандай і калі трэба — не грэбуе стукацтвам, толькі ў гэтым выпадку не з высокай ідэі пабудовы камунізму, а з асабістых прычын. Хочаш зрабіць подласць — краіна табе дапаможа.

У першую чаргу, здаецца, спектакль усё ж не пра час, хоць яго спасціжэнне праз непадобных адзін на аднаго персанажаў, камедыйныя сцэны, прыгожае перапляценне настрояў надзвычай займальнае. У рэшце рэшт «Сірожа» ператвараецца ў саму па сабе жанравую драматычную гісторыю. Каларытны 1980-ы адыходзіць на другі план і ў другім акце — сустракайце пастарэлых герояў і выканаўцаў іх роляў — расплываецца лірыка і асабістыя рэфлексіі аб мінулых учынках, крыўдзе і помсце.

Матыў падмяняе сабой спосаб дзеяння, самакапанне — дынаміку надрыўнага кахання з удзелам пяці чалавек, унутраныя дэманы — дэманаў савецкай сістэмы. Накал страсцей у інтэрнатным пакоі і драма-драма застаюцца ў «маладосці», а зручны грамадзянін Сірожа становіцца пераможцам па жыцці.

Прэм'ера пастаноўкі адбылася ў РТБД 10 ліпеня. «Сірожа» — гэта трапная і атмасферная гісторыя пра 1980-ы і ўтрываваная і бляклая асабістая драма. І ўсё ж камедыя, трагічныя сцэны і амаль нуарная навіслаcць эпохі становяцца, відаць, абавязковымі да прагляду ў новым тэатральным сезоне.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# БАНК ДАБРАБЫТ

**Открытое акционерное общество «Банк Дабрабыт»**
**220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом. 1**
**УНН 807000002**

## Бухгалтерский баланс на 1 июля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2019 | 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 22 617 | 22 394 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 77 153 | 139 502 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 136 834 | 65 497 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 293 619 | 302 155 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 566 413 | 588 559 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 86 | 33 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 176 | 176 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 42 360 | 43 367 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | 241 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 700 | 226 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 9 631 | 11 313 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 1 149 589 | 1 173 463 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | 21 598 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 73 922 | 90 053 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 854 087 | 886 981 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 79 332 | 37 549 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 344 | 26 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 9 554 | 10 822 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 1 017 239 | 1 047 029 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 30 642 | 27 382 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 12 372 | 10 250 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 26 470 | 26 820 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 62 866 | 61 982 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 132 350 | 126 434 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 149 589 | 1 173 463 |

## Отчет о прибылях и убытках на 1 июля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2019 | 01.07.2018 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 43 060 | 35 709 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 29 281 | 19 999 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 13 779 | 15 710 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 17 250 | 16 963 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 6 521 | 6 277 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 10 729 | 10 686 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 1 659 | (62) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 8 906 | 9 567 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (77) | 216 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | (272) | (3 507) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 2 453 | 769 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 22 113 | 19 444 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 2 307 | 3 522 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 13 301 | 17 427 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 607 | 4 182 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 11 694 | 13 245 |

**Председатель Правления** **И. В. Лихогруд**
**И. о. главного бухгалтера** **С. И. Миркевич**

**Квартальная индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка: https://bankdabrabyt.by/about/finance/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности №16 выдана Национальным банком Республики Беларусь 28 января 2019 года.
УНП 807000002

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже квартиры, принадлежащей Федерации профсоюзов Беларуси**

**Лот №1:** квартира с инв. № 620/D-22089, 1989 г. п., площадь 110,9 м². Адрес: г. Фаниполь, ул. Янки Купалы, 17-2.
**Земельный участок:** кадастровый номер 622250600001001963 площадь 0,0742 га. Вид права — право аренды. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Начальная цена** — 30 000,00 дол. США. **Задаток** — 5 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** — 5 %.
**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. 2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % от цены продажи Лота №1 без учета НДС в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Валюта платежа вознаграждения – белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона. 4. На Победителя аукциона (Претендента на покупку) при переходе права собственности на Объект переходят соответствующие права на земельный участок с кадастровым номером 622250600001001963

**Аукцион состоится 14.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: учреждение «ДИРЕКЦИЯ ПО УПРАВЛЕНИЮ СОБСТВЕННОСТЬЮ ФПБ», г. Минск, пр-т Победителей, д.21, ком. 907, т. 8(017) 203-97-72. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **14.08.2019**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений — **12.08.2019** в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Лазаревич Татьяна Ивановна, тел. 8 (029) 654-80-22

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, www.ino.by, e-mail: torgi@ino.by**

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже административного здания и производственной базы, принадлежащих ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ»-управляющая компания холдинга», по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 51**

**Лот № 1, состав:** 1. Здание административно-бытового корпуса, цех № 2, инв. № 600/С-104762, площадь — 1332,6 кв. м. 2. Здание гаража № 1, инв. № 600/С-74978, площадь — 455,8 кв. м. 3. Здание проходной, инв. № 600/С-74931, площадь — 11,6 кв. м. 4. Здание цеха №1, инв. № 600/С-74914, площадь — 730,4 кв. м. 5. Здание склада № 4, инв. № 600/С-75003, площадь — 163,6 кв. м. 6. Здание склада № 1, инв. № 600/С-74926, площадь — 840,4 кв. м. 7. Здание служебно-техническое, инв. № 600/С-75040, площадь — 62,1 кв. м. 8. Здание склада № 2, инв. № 600/С-75015, площадь – 529 кв. м. 9. Здание склада № 3, инв. № 600/С-75024, площадь — 264,3 кв. м. Обременение: аренда (полный список приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). **Земельный участок:** кадастровый номер 623683403101001372, площадь – 2,8449 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена, бел. руб. – 4 246 128,00. Задаток, бел. руб. – 424 612,80. Шаг аукциона – 2 %**

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона. 2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи. 3. Оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,7 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

**Аукцион состоится 13.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» — управляющая компания холдинга», 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 4, тел. 8 (017) 200-71-17. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 13.08.2019 (ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» — управляющая компания холдинга», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений — 09.08.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Смеян Сергей Васильевич, тел. 8 (029) 115-12-34

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, www.ino.by, e-mail: torgi@ino.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «Юридическая группа «ПАРТНЕР», тел. +375 44 719 44 14 |
| **Продавец** | ООО «СИДКОМ», г. Смолевичи, ул. Торговая, д.14а, тел. +375 44 719 44 14 |

**Предмет аукциона**

**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Московская, д. 64б**

| № лота | Инв. номер | Наименование | | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг аукциона бел. руб. без НДС 5 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 612/С-6270 | Капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – расширение собственной базы, площадь – 549,0 кв. м | | **91 060,00** | **4553,00** |
| 2 | 612/С-6271 | Капитальное строение, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – производственные мастерские с туалетами | Площадь – 214,7 кв. м | **127 530,00** | **6375,50** |
| | 612/С-6272 | Капитальное строение, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – гараж | Площадь – 303,7 кв. м | | |

**Составные части, принадлежности, документы:** свидетельства о гос. регистрации объектов недвижимости, свидетельства о гос. регистрации земельных участков, договоры аренды

| | |
|---|---|
| **Сведения об обременениях** | Ограничительные действия по регистрации (налоговая) |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется с 10.00 до 15.00 во все дни недели, кроме суб. и воскр. по предварительному согласованию по тел. +375 44 719 44 14, Марат Михайлович |

**Задаток:** в размере 10 % перечисляется на р/с BY83RSHN30126876200190000000 в ЗАО «Банк «Решение», г. Минск, БИК: RSHNBY2X. Получатель – ООО «Юридическая группа «ПАРТНЕР», УНП 791043872. **Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по продаже имущества, проводимом 15 августа 2019 г.

**Срок подписания договора купли-продажи**: не позднее 5 рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты**: в течение 15 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина Республики Беларусь от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». Информацию о документах, необходимых для участия в аукционе, порядке его проведения, оформления результатов вы можете получить по телефону +375 44 719 44 14. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | 15 августа 2019 г. в 12.00<br>г. Жодино, ул. Московская, д. 64б |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | 14 августа 2019 г. до 17.00<br>212029, г. Могилев,<br>пр-т Шмидта, 58—139 |
| **Контакты** | +375 44 719 44 14, Марат Михайлович<br>kolesnickov.marat@yandex.ru |

---

## СВЕТЛОГОРСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды земельного участка

**Аукцион состоится в 11.00 16 августа 2019 года** в зале заседаний райисполкома по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1 (2-й этаж).

Назначение участка: для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 01 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)).

Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка: № 325050100002005360, расположенный по адресу: Гомельская область, Светлогорский район, г. Светлогорск, ул. Песочная.

Площадь земельного участка: 0,1500 га. Начальная цена: 3 152 руб. 12 коп. Сумма задатка: 600 руб. Срок аренды 25 лет.

Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций: имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне, прибрежной полосе реки и водоема).

Условия продажи права аренды: победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе государственной регистрацией в отношении этого участка;

заключить с Светлогорским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав, ограничений прав на земельный участок;

получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к строительству объекта в течение одного года (шести месяцев) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;

снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно строительному проекту;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

по минованию надобности возвратить земельный участок, предоставленный в аренду в состоянии, пригодном для использования или продлить в установленном порядке срок пользования им.

К участию в аукционе допускается: гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо, подавшее заявление на участие в аукционе и заключившее соглашение со Светлогорским райисполкомом, с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение задатка, с отметкой банка. Задаток перечислятся на расчетный счет на расчетный счет № BY27AKBB36044290020443200000 в ЦБУ № 322 филиала № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21312 УНП 400019707, Светлогорский райисполком; назначение платежа – задаток на аукцион;

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность, документ, удостоверяющий личность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

**Документы для участия в торгах принимаются** по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, каб. 31, отдел экономики райисполкома с 8.30 до 17.30 по рабочим дням с даты опубликования извещения **до 12 августа 2019 года включительно**. Заключительная регистрация в день аукциона с 10.00 до 11.00 по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1, каб. 31 (3-й этаж, правое крыло). Телефоны: 8 (02342) 90839, 53066.

**Условия проведения аукциона** – наличие не менее двух участников, при наличии одного участника предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Порядок осмотра на местности земельных участков**: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

Извещение о выставление указанного выше лота было опубликовано ранее в газете «Сельская газета» 22.11.2018 г. № 138.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667».

---



| | |
|---|---|
| Предмет аукциона и его местонахождение | **Лот –** здание бывшей пожарной части в Волковысском районе, аг. Подороск, ул. Брестская, 21 |
| Начальная цена предмета аукциона | 21 123 рубля; размер задатка – 2 200 рублей (покупателю имущества в установленном порядке может быть предоставлена рассрочка оплаты приобретенного имущества) |
| Продавец недвижимого имущества | Отдел культуры Волковысского райисполкома. Тел. 8 (01512) 4 51 74, 4 50 25 |
| Характеристика объектов | **Капитальное строение с инв. № 410/С-15646** (**здание пожарной части с двумя пристройками, навесом** (инв. № 01000120) – 1996 г. п., 1-й этаж, S общ. – 245,2 кв. м, кирпичное, полы – плиточные, плита ДСП, керамическая плитка, крыша – волнистый шифер, окна – дерево, ПВХ, навес – 10 кв. м, на металл. столбах, стены решетчатые из кирпича, высота 1,0 м, полы – плитка тротуарная, кровля – шифер волнистый; **мощение с бордюром** (инв. № 01100217) – плитка цементно-песчаная, 134,0 кв. м, бордюр бетонный 22,10 м). **Воздушная линия электропередачи** (инв. № 01200071) – 20,0 кв. м, кабель марки АВВГ 4*10 |
| Информация о земельном участке | Срок аренды земельного участка площадью 0,1171 га (под застройкой) по 1 апреля 2069 г. |
| Условия продажи недвижимого имущества* | Использование приобретенного объекта под цели, не противоречащие законодательству Республики Беларусь, начало использования – не позднее 3 лет с даты заключения договора купли-продажи |
| Условия использования земельного участка | В установленном порядке использовать земельный участок для размещения туристических объектов с условием сохранения историко-культурной ценности, обеспечения охраны и реставрации значимых в историко-культурном отношении зданий и сооружений;<br>получение архитектурно-планировочного задания и технических условий для инженерно-технического обеспечения объектов строительства, разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и строительство или получение решения Волковысского РИК об изменении назначения недвижимого имущества без проведения строительно-монтажных работ (в случае изменения назначения недвижимого имущества, реализуемого на аукционе);<br>осуществление строительства, реконструкции объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией |
| Ограничения по использованию земельного участка | Водоохранные зоны рек и водоемов на площади 0,1171 га |

Организатор аукциона: комитет «Гроднооблимущество». Аукцион состоится **31 июля 2019 года в 11.30** по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **26 июля 2019 года до 17.00.**
Контактные телефоны: 8 (0152) 72 25 18; 72 21 02. Сайты: http://www.region.grodno.by; http://www.gki.gov.by УНП 500007142

# Вольга ХУДЗЕНКА: «Я ЯШЧЭ НЕ ХУТКА СПЫНЮСЯ»

## Пра слёзы, пот і перамогі самага беларускага віду спорту

**Нашы весляры сталі сапраўднымі трыумфатарамі II Еўрапейскіх гульняў, на іх рахунку дзесяць медалёў, пяць з іх — залатыя. Вольга Худзенка стала ўладальніцай дзвюх узнагарод вышэйшай пробы, а акрамя гэтага, сярэбраным і бронзавым прызёрам турніру. Такі вынік важны асабліва цяпер, за паўтара месяца да ліцэнзійнага чэмпіянату свету, дзе стане зразумела, ці выступіць Вольга на трэцяй для сябе Алімпіядзе.**



Пасля тыднёвага адпачынку дзяўчына зноў днямі знікае на вяслярным канале ў Гомелі, тут спартсмены, не звяртаючы ўвагі на дажджлівае надвор'е і моцны вецер, адпрацоўваюць па дзве трэніроўкі ў дзень. У перапынку паміж імі Вольга расказала карэспандэнту «Звязды» пра свой звілісты шлях у спорце і пра тое, як магла вырасці чэмпіёнка па веславанні ў месцы, дзе няма ніводнага вадаёма.

## «На фінішы скаланалася вада»

***— Вядома, пачнём з вашага паспяховага выступлення на Еўрапейскіх гульнях у Мінску, раскажыце, якія ўражанні ў вас у цэлым засталіся ад гэтага турніру?***

— Гэта было вельмі маштабнае мерапрыемства для нашай краіны, я лічу, што яно прайшло на высокім узроўні. Беларусь паказала сябе ва ўсёй красе, таму ў далейшым, я думаю, яе будуць разглядаць для правядзення сур'ёзных маштабных турніраў. Што да майго выступлення, я, вядома, бязмерна радая медалям. Нам з Марынай Літвінчук *(дзяўчаты разам на фота)* ледзь не пашанцавала ў байдарцы двойцы на 200 метраў. Літаральна перад заездам пачаўся сапраўдны шторм: шквалісты вецер з даждком. Мы да апошняга спадзяваліся, што заезд адменяць. Са старту не трапілі ў грабок, але, дзякуй богу, завявалі «бронзу». У цэлым, я лічу, што мы годна прадставілі сваю краіну — з шасці дысцыплін узялі пяць медалёў. Каманда была максімальна гатовая, мы разумелі, што ўся краіна будзе глядзець на нас, як на фаварытаў, таму было яшчэ і хвалюючна. Да таго ж на трыбунах былі мама, сваякі, сябры і знаёмыя з майго горада. Мама па тэлевізары нават ніколі не глядзіць мае гонкі, таму што вельмі перажывае, хвалюецца. Гэта для яе быў першы раз непасрэдна на канале. На папярэдніх заездах яна выбягала з трыбун, настолькі не магла сябе кантраляваць. Але ў плане падтрымкі я яшчэ не адчувала такога патоку сіл, мне здавалася, што на фінішы скаланалася вада.

***— Да такіх складаных умоў надвор'я вы былі гатовыя?***

— Зразумела, ведаем, што наш канал размешчаны ў такім месцы, дзе ўмовы могуць быць розныя, трэнер нас да гэтага падводзіў. Мы рыхтаваліся да Еўрапейскіх гульняў у Партугаліі, каля акіяна. Там дзьмула кожны дзень, кожную гадзіну.

***— Ведаю, што вам не ўдалося пабываць на цырымоніі адкрыцця Гульняў.***

— Так, бо мы заязджалі ў Вёску спартсменаў толькі 22 чэрвеня, а вось на цырымонію закрыцця схадзілі. Я ўдзельнічала ў дзвюх Алімпіядах, у Еўрапейскіх гульнях у Баку, але ні разу не была ні на адной з цырымоній, так што для мяне гэта ўпершыню. Такі табун мурашак па целе прабег, калі выходзіла наша каманда, увесь стадыён апладзіраваў стоячы. Гэта невымоўныя эмоцыі.

***— Вы адзначалі, што не надта святкавалі свае перамогі.***

— На цяперашнім этапе разумеем, што выступілі добра, але праз паўтара месяца спаборніцтвы больш сур'ёзныя — ліцэнзійны чэмпіянат свету, дзе мы павінны ўзяць максімальную колькасць пуцёвак для таго, каб як мага лепш прадставіць краіну на Алімпіядзе ў Токіа.

## «Намі рухае алімпійскае «золата»

***— Вы з 2013 года не выступалі разам з Марынай Літвінчук у двойцы, з чым гэта было звязана?***

— На той момант, можа, я яшчэ была маладая, тэхнічныя нашы магчымасці не супадалі, Марына была ўжо вышэй узроўнем. Магчыма, нам абедзвюм чагосьці не хапала. У нас быў вынік, але не было стабільнасці. Марына вырашыла паспрабаваць двойку з іншымі дзяўчатамі. А пасля таго як яна вярнулася ў спорт пасля нараджэння дзіцяці, мы зноў паспрабавалі сесці разам. Першы старт у двухсотцы летась атрымаўся не вельмі ўдалы, але вырашылі, што трэба папрацаваць яшчэ. Выступілі першы раз за шэсць гадоў на 500 метраў і выйгралі этап Кубка свету. Пачалі адна адну адчуваць, гэта вельмі важна ў камандным экіпажы.

***— Наколькі складана падабраць сабе партнёра ў веславанні?***

— У першую чаргу людзі павінны супадаць па тэхніцы, потым па сілавых якасцях і па манеры праходжання дыстанцыі. Яны павінны ехаць прыкладна на адным узроўні і праходзіць аднолькавую падрыхтоўку.

***— Якія дыстанцыі падабаюцца вам больш за ўсё?***



Вольга наперадзе.

— На трэніроўцы «любімая» — 5 кіламетраў. Складана мне яна даецца, але прыходзіцца пераадольваць сябе для фізічнага развіцця. А на самай справе, мая любімая дыстанцыя — гэта 500 метраў — і ў двойцы, і ў чацвёрцы, і ў адзіночцы. 200 метраў таксама падабаецца, але пакуль мне крыху не хапае стартавай хуткасці. Я працую над гэтым.

***— Веславанне — фізічна адзін з самых цяжкіх відаў спорту. Што дапамагае вам пераадольваць вар'яцкія нагрузкі кожны дзень?***

— Сапраўды, веславанне можна назваць універсальным відам спорту, таму што ў ім спалучаецца сіла, цягавітасць і цярпенне. Вясляр павінен умець плаваць, скакаць, выконваць сілавую работу і нават на лыжах ездзіць. Што датычыцца штодзённай матывацыі, я думаю, кожны спартсмен адкажа вам, што намі рухае алімпійскае «золата». Ад Алімпіяды да Алімпіяды ты толькі гэтым і жывеш. У мяне ўжо пройдзена двое Гульняў, а нейкая недавыканасць застаецца. Крыўдная «бронза» ў Рыа... Мне здавалася, мы былі гатовыя на большае, але з-за вядомай усім сітуацыі са зняццем практычна ўсёй нашай каманды, умовы там былі складаныя. Гэта адбілася на нашым выніку. Цяпер намі рухае яшчэ і тое, што хочацца даказаць: мы сапраўды вартыя больш сур'ёзных узнагарод ва ўсіх экіпажах. Кожны дзень ты выходзіш і разумееш, што абавязана, павінен у першую чаргу сам самасцвердзіцца і даказаць родным, блізкім, трэнеру, што годны гэтых узнагарод.

***— Думаеце, калі ў Токіа выйграеце «золата», спыніцеся?***

— Не, я яшчэ не хутка спынюся. Але перапынак, хоць бы ў годзік, хацела б зрабіць, таму што тры алімпійскія цыклы — гэта сур'ёзна. Патрэбен адпачынак.

***— Эмацыянальна бывае цяжка, ад вас жа пастаянна чакаюць добрага выніку?***

— Я стараюся пра гэта ўвогуле не думаць, таму што гэта сапраўды заганяе. Для мяне галоўнае — устаць і паказаць тое, на што я здольная.

***— На Еўрапейскіх гульнях вы выйгралі ў алімпійскай чэмпіёнкі, гэта дае дадатковую ўпэўненасць перад ліцэнзійным чэмпіянатам свету?***

— Данута Козак — пяціразовая чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў, на міжнародных стартах у адзіночцы да гэтага яна прайграла, напэўна, толькі аднойчы, у 2011 годзе. Мне заўсёды здавалася, што яна як робат — непераможная. Летась, калі я стала з ёй у адзін заезд, разумела, што не магу ў яе выйграць, не ўяўляла, што мне трэба зрабіць для гэтага, над чым працаваць. І вось папрацаваўшы яшчэ гадок, я зразумела, што з ёй можна змагацца. Але цяпер я выйграла ў сябе дома, а ў жніўні мы будзем спаборнічаць у яе дома.

## «Я была такая слабая, нязграбная, няўстойлівая»

***— Вы нарадзіліся ў Хойніках, там развіта веславанне?***

— Ды вы што, у нас няма ні аднаго вадаёма, можа, толькі маленькае балота. Я займалася лёгкай атлетыкай, як усе школьнікі, а ў адзін момант хтосьці вызначыў, што ў мяне шырокія плечы, значыць, тэрмінова трэба ісці ў веславанне. У Хойнікі прыехаў мой першы трэнер — Міхаіл Канстанцінавіч Азёмша — і забраў мяне ў Мазырскае вучылішча алімпійскага рэзерву. Не ведаю, што ён ува мне разгледзеў, я была такая слабая, нязграбная, няўстойлівая, выварочвалася раз за разам. Настолькі ў мяне першапачаткова нічога не атрымлівалася. Тэлефанавала, скардзілася маме, ды і першапачаткова не хацела ехаць у Мазыр, але мяне ўсе сваякі ўгаворвалі, пераконвалі, што гэта, магчыма, мой адзіны шанц, каб з'ехаць з Хойнікаў і дасягнуць чагосьці ў гэтым жыцці. Напэўна, на той момант гэта сапраўды было так. А як толькі пайшлі маленькія перамогі, мяне ўсё гэта зацягнула, я любімі спосабамі, за любыя нітачкі хапалася, толькі каб застацца ў гэтым відзе спорту.

***— А першыя поспехі прыйшлі хутка?***

— Я пачала займацца веславаннем у 14 гадоў, у 18 выйграла юніёрскі чэмпіянат Еўропы ў адзіночцы на 1000 метраў і 500 метраў. У 2009 годзе паступіла ва ўніверсітэт і перайшла трэніравацца да свайго цяперашняга трэнера Генадзя Мікалаевіча Галіцкага. Літаральна праз год набрала вельмі добрую форму, магчыма, падрасла, паразумнела, падужэла фізічна. Генадзь Мікалаевіч накіраваў мяне ў патрэбнае рэчышча. А першым паспяховым годам у дарослых спаборніцтвах для мяне стаў 2011-ы.

***— Што для вас значыць перамога сёння?***

— Для мяне гэта не проста медаль. Наўрад ці які-небудзь спартсмен, падымаючыся на п'едэстал, успамінае, як яму гэта ўсё давалася, усведамленне прыходзіць праз нейкі час. Гэта слёзы, пот, гэта нервы, няўдачы. Бо на самай справе няма ніякай прамой, шлях спартсмена настолькі звілісты... Простаму чалавеку цяжка зразумець, што перажывае спартсмен падчас штодзённых знясільваючых трэніровак. Асабліва ў такія сур'ёзныя гады, як цяпер, у перадалімпійскія. Таму для мяне перамога — гэта перш за ўсё самарэалізацыя, нагода даказаць трэнеру, родным, блізкім, што ў цябе не дарма ўкладаюць сілы. Калі ты стаіш, развяваецца твой сцяг, іграе гімн — гэта проста невымоўныя адчуванні. Дай бог кожнаму спартсмену гэта адчуць.

***— Вам 27, а за плячыма ўжо дзве Алімпіяды...***

— У Лондан я трапіла ў 20, гэта ўзровень. Атмасферу тады асабліва не адчула, таму што мы жылі за 30 кіламетраў ад горада, не ў алімпійскай вёсцы. Што датычыцца Рыа, мы з дзяўчатамі прыехалі туды ўчатырох, нават без свайго трэнера. Было цяжка, разумелі, што павінны выступіць за ўсіх. Таму ў Бразіліі атрымаліся незразумелыя гонкі, з незразумелымі эмоцыямі.

***— Які адбітак накладвае прафесійны спорт на ваша жыццё?***

— Прафесійны спорт мяне вельмі моцна загартаваў як асобу, выхаваў. У кожнага спартсмена не заўсёды бываюць перамогі, часам, вельмі цяжка, але калі шчыра, без яго я наогул сябе не ўяўляю. Нават на адпачынку заўсёды ўмудраюся пайсці на ваду. Да такога ладу жыцця прывыкаеш, гэта становіцца ўжо нармальным.

***— Што захапляе вас па-за спортам?***

— Люблю чытаць. Аддаю перавагу літаратуры для спартсменаў і біяграфіям. Спрабую вывучаць англійскую мову.

***— Чыя біяграфія вас уразіла больш за ўсё?***

— Біргіт Фішэр — самая тытулаваная нямецкая спартсменка ў веславанні. Я ёю заўсёды захаплялася, для мяне гэта эталон і прыклад для пераймання. Як чалавек і спартсменка яна мяне вельмі матывуе, таму што Біргіт пачала выйграваць з 18 гадоў і будучы ў 50-гадовым узросце, хацела вярнуцца ў спорт, каб выступіць на Алімпіядзе ў Бразіліі. Нямецкія ўрачы не дапусцілі яе па стане здароўя, але, думаю, яна паказала б нядрэнны вынік там і магчыма нават мне ўдалося б паспаборнічаць са сваім кумірам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**
*г. Гомель.*

Базарны дзень

# ВАЛОШКАВАЕ ШЧАСЦЕ ДЛЯ КСЮШЫ ГАЛЕЦКАЙ




**«Я неверагодна шчаслівая!» — прызналася 11-гадовая спявачка Ксенія Галецкая, пачуўшы ад журы міжнароднага дзіцячага конкурсу на «Славянскім базары ў Віцебску», што менавіта яна стала пераможцай.**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Акрамя Гран-пры і спецыяльнага прыза «Ліра» юная артыстка разам з прадстаўніцай Расіі Кірай Гагаладзэ атрымала прыз ад Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

«Калі назвалі маё прозвішча, спачатку была ў нейкім ступары, потым закрычала, заплакала і толькі пасля, калі канчаткова паверыла ў сваю перамогу, — усміхнулася. Перамога на «Славянскім базары» — маё самае вялікае дасягненне, я старалася годна прадставіць нашу Беларусь і ганаруся, што гэта атрымалася», — па-даросламу заўважыла Ксюша пасля абвяшчэння вынікаў.

Як адзначыў старшыня журы, шведскі кампазітар і спявак Bosson, наогул усе ўдзельнікі дзіцячага конкурсу ўразілі яго высокім прафесіяналізмам, а таму ўсе з'яўляюцца пераможцамі. «Мяне скарылі вашыя выступленні і галасы, ідзіце за сваім сэрцам і марай, я бачу кожнага з вас у будучыні вялікім артыстам».

Першую прэмію конкурсу атрымала Анжэла Алберцян з Арменіі, другую журы падзяліла паміж Артурам з Украіны і Анастасіяй Барбэ, якая прадстаўляла Малдову. Трэцяя прэмія таксама знайшла адразу дваіх гаспадароў — дакладней, гаспадынь, бо гэта Анушка з Грузіі і Кіра Гагаладзэ з Расіі. Многія ўдзельнікі конкурсу атрымалі ад членаў журы запрашэнні на іншыя міжнародныя фестывалі.

...Сёння Ксенія Галецкая прымае віншаванні ўжо дома і працягвае займацца з педагогамі вакалам. А яе мама Ірына расказала «Звяздзе», што перажывала ледзьве не больш за дачку:

— Ксюша вельмі адказная, і яна разумела, што будзе прадстаўляць усю нашу краіну, таму выкладвалася напоўніцу. Я старалася настроіць яе на пазітыўны лад, нагадвала, што за спінай чатыры месяцы падрыхтоўкі з вялікай прафесійнай камандай прадзюсарскага цэнтра «Спамаш», таму ўсё абавязкова атрымаецца добра. Але за кулісамі, канешне, таксама вельмі перажывала за дзіця, таму цяпер радуюся разам з ёй. Гэта сапраўды вялікі поспех і дасягненне Ксюшы і ўсёй каманды.

**— Неўзабаве пасля конкурсу ў Ксюшы дзень нараджэння, ёй споўніцца 12 гадоў. І хоць галоўны падарунак — перамогу ў конкурсе — яна зрабіла сабе сама, упэўнена, што вы таксама рыхтуеце дачцэ сюрпрыз...**

— Так, мы пакуль трымаем гэта ў сакрэце, але падорым самакат. Справа ў тым, што малодшаму брацiку, якому год і дзесяць месяцаў, купілі маленькі, і Ксюшы ён надзвычай спадабаўся, назазала колы, нягледзячы на тое што ён нязручны для яе па росце. Таму усю выбралі і заказалі самакат для яе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# МАСТАЦТВА, ЯКОЕ ЗЛУЧАЕ

## АДПАВЕДНА ЎЗРОЎНЮ

**Учарашні дзень на «Славянскім базары» вызначыўся вялікай культурнай праграмай, прысвечанай 20-годдзю падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.**



Тры выставачныя праекты адкрыліся ў Віцебскім мастацкім музеі з удзелам высокіх гасцей: дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты і намесніка міністра культуры Расійскай Федэрацыі Мікалая Аўсіенкі. «Кожны раз, рыхтуючыся да «Славянскага базару», мы выбіраем, якія культурныя мерапрыемствы правесці ў Віцебску, каб яны адпавядалі высокаму ўзроўню фестывалю, — расказаў на адкрыцці экспазіцыі Рыгор Рапота. — І ўжо сёння ёсць задумкі на наступны год».

Удзень 12 ліпеня ў музеі-сядзібе «Здраўнёва» адбылася медыясесія «Саюзная дзяржава: як перадаць культурны код моладзі», падчас якой прадстаўнікі вядучых музеяў і ўстаноў культуры абедзвюх дзяржаў абмяркавалі пытанні захавання спадчыны і развіцця агульнай культурнай прасторы Беларусі і Расіі.

А ўвечары прайшоў канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае...», лейтматывам якога стала 50-годдзе творчай дзейнасці легендарнага ансамбля «Песняры». Павіншавалі юбіляраў на сцэне Летняга амфітэатра калегі-выканаўцы: Пётр Елфімаў, Анатоль Кашапараў, Варвара, «Сапрана Турэцкага», этнатрыа «Троіца», гурт NAVIBAND і іншыя.

## БЛІСКУЧА!

**Такое азначэнне можна даць адразу двум выстаўкам, якія адкрыліся ў Віцебску ў Дзень Саюзнай дзяржавы.**

Першую з іх — «Растоўскую фініфць» — прадставіла аднайменная расійская фабрыка. Наогул, фініфць (выраб мастацкіх твораў з дапамогай эмалі на металічнай падложцы, што вызначаецца яркасцю і чысцінёй фарбаў) адносіцца да старажытных дэкаратыўна-мастацкіх промыслаў. У прыватнасці, у Растове яе гісторыя налічвае больш за 200 гадоў. Тонкасці і сакрэты тэхналогіі фініфці мастакі і ювеліры перадавалі з пакалення ў пакаленне, не выносячы іх за сцены майстэрняў.

У Віцебск з Растова прыехала, безумоўна, толькі невялікая частка калекцыі, але нават яна дае выразнае ўяўленне пра гэты від ювелірнага мастацтва. Зграбныя ўпрыгожанні: завушніцы, каралі, брошкі, якія прадэманстравала на паказе шоу-група Студыі моды Сяргея Нагорнага, мініяцюрныя партрэты або пейзажы, у якіх самы пільны глядач можа прызнаць краявіды, бачаныя ў фільме «Іван Васільевіч змяняе прафесію», прыгожы посуд — кубкі, талеркі, каўшы, ікорніцы, а таксама вокладкі для кніг, культавыя прадметы... Убачыць усю гэту прыгажосць, а тое-сёе пры жаданні і набыць, дарэчы, можна да 28 ліпеня — столькі выстаўка прабудзе ў сценах Віцебскага мастацкага музея.

А вось рэпліку Вялікай імператарскай кароны Расійскай імперыі, якую ў 2012 годзе стварылі смаленскія ювеліры да 250-годдзя арыгінальнай кароны і 400-годдзя дома Раманавых, прывезлі на «Славянскі базар» толькі на адзін дзень. Яно і зразумела: кошт гэтага шэдэўра ювелірнага мастацтва з белага золата, упрыгожанага аўстралійскімі перлінамі, рэдкім каменем рубелітам і больш чым 11 тысячамі якуцкіх алмазаў, перавышае 100 мільёнаў долараў! «Паводле ацэнак спецыялістаў, мастацкая каштоўнасць, майстэрства выканання рэплікі не саступаюць арыгіналу», — падкрэсліла на адкрыцці экспазіцыі **генеральны дырэктар расійскага некамерцыйнага партнёрства «Нацыянальны калекцыйны цэнтр мастацкіх вырабаў» Галіна АНАНЬЕВА**.

Мастацтвазнаўцы і гісторыкі заўважылі і пэўны сімвалізм: выстаўка праходзіла ў зале з партрэтам імператрыцы Кацярыны II — якраз з яе кароны і рабілася каштоўная рэпліка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Актуальна

# ПЕРАМОГА КАВАЛАСЯ Ў БЕЛАРУСІ!



**Гэты баявы вопыт вывучаюць гісторыкі ўсяго свету. Аперацыя «Баграціён» стала не толькі адной з самых буйных ваенных падзей у гісторыі (так, з савецкага боку ў ёй было задзейнічана 1,5 мільёна савецкіх салдат і афіцэраў плюс больш чым трыста тысяч партызан), падчас яе савецкае камандаванне апрабавала новыя метады вядзення вайны.**

Што адбывалася на беларускай зямлі ў 1944 годзе і які ўнёсак аперацыі ў сусветную гісторыю і канчатковую перамогу ў Другой сусветнай вайне, абмяркоўвалі вучоныя падчас канферэнцыі, якая была арганізавана Нацыянальнай акадэміяй навук, Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь, Дэпартаментам па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі РБ, Нацыянальным архівам.

У канферэнцыі прыняло ўдзел каля пяцісот вучоных — гісторыкаў і архівістаў Беларусі, Расіі, Арменіі, Азербайджана, Германіі, Літвы, прадстаўнікі сілавых ведамстваў, студэнты і курсанты грамадзянскіх і ваенных навучальных устаноў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. На форуме абмяркоўваліся найактуальнейшыя пытанні, найноўшыя дасягненні вучоных, прэзентаваліся вынікі апошніх даследаванняў і кнігі, якія падрыхтавалі гісторыкі. Сярод тэм, якія хвалююць сучасных даследчыкаў, праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства, нацысцкая акупацыйная палітыка, партызанскі рух і падпольная барацьба на акупаванай тэрыторыі Беларусі, савецкае ваеннае мастацтва падчас Другой сусветнай вайны.



Як заўважыў **дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ**, такія маштабныя форумы дазваляюць транслiраваць наш погляд на гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, супрацьстаяць спробам фальсіфікацыі мінулага і выпрацоўваць імунітэт супраць такіх спроб, бо ў падобных мерапрыемствах прымаюць удзел не толькі вучоныя, але і моладзь.



Да падрыхтоўкі мерапрыемства падключыліся многія арганізацыі, у межах канферэнцыі дэманстраваліся ўнікальныя архіўныя дакументы, літаратура, якая выдавалася ў часы Вялікай Айчыннай вайны, а таксама экспанаты, якія прывёз Бягомльскі краязнаўчы музей.

У час канферэнцыі бібліятэка Акадэміі навук папоўнілася каштоўнымі экспанатамі — дырэктар нямецкага выдавецтва ENOS Клаўс-Дзітар Цэнтграф перадаў нумары газеты «Чырвоная Армія», якія былі надрукаваны ў 1944 годзе і сведчаць пра вызваленне вялікіх тэрыторый падчас аперацыі «Баграціён». Ваенныя журналісты, якія выдавалі гэту газету, падарожнічалі разам з часцямі Чырвонай Арміі, асвятлялі ваенныя падзеі, якія адбываліся ў той час. Газеты праехалі праз палову Еўропы, а пасля заканчэння вайны падшыўка некалькі дзесяцігоддзяў захоўвалася ў Германіі. Таксама некалькі нумароў газеты «Чырвоная Армія» нямецкі даследчык перадаў у Беларускі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

# СУСВЕТНАЯ СМАГА

## Як выйсці з «воднага стрэсу»?

**У Чэнаі (колішні Мадрас) — шостым па велічыні горадзе Індыі з насельніцтвам каля 10 мільёнаў чалавек — катастрафічна не хапае вады, перадае Бі-бі-сі. У сталіцы штата Тамілнад жыццё фактычна замерла: закрылі дзяржаўныя ўстановы, многія кафэ, рэстараны і гасцініцы таксама былі вымушаны прыпыніць работу. Як паведаміў Метэаралагічны дэпартамент Індыі (IMD), гарадскія службы скарацілі водазабеспячэнне амаль на 40 працэнтаў. Жыхары Чэнаі штодня праводзілі па некалькі гадзін пад пякучым сонцам у чаканні цыстэрнаў з пітной вадой, якія ўлады прывозілі з аддаленых раёнаў штата. Надзвычайная сітуацыя ўзнікла ў мегаполісе пасля таго, як з-за спякоты высахлі чатыры размешчаныя ў яго ваколіцах вадасховішчы. Урад штата не рабіў якіх-небудзь радыкальных захадаў, накіраваных на прадухіленне гуманітарнай катастрофы, спадзеючыся на хуткае наступленне сезона мусонных дажджоў. Як пераканаы эксперты, сітуацыя ў Чэнаі адлюстроўвае сусветную тэндэнцыю. Як выйсці з глабальнага «воднага стрэсу»?**



### ПАМІЖ ЗАСУХАЙ І ЗАЛЕВАЙ

Мінулы месяц стаў адным з пяці самых засушлівых чэрвеняў у гісторыі метэаназіранняў у Індыі за апошнія 100 гадоў. Па ўсёй краіне ападкаў выпала на 35 працэнтаў менш за норму, паведамляе The Times of India. Дагэтуль толькі чатыры разы ападкаў у чэрвені выпадала менш — у 1923-м, 1926-м, 2009-м і 2014-м гадах. Затрымка з прыходам фронту мусонных дажджоў узмацніла недахоп вады ў многіх частках Заходняй і Паўднёвай Індыі. Да крытычнага для сельскай гаспадаркі, вытворчасці электраэнергіі і пастаўкі насельніцтву пітной вады ўзроўню ўпалі запасы ў 90 рэзервуарах і вадасховішчах, якія кантралюе дзяржава. Анамальная спякота, якая пачалася ў Індыі яшчэ ў сярэдзіне мая, прывяла да маштабнай засухі, ахвярамі якой сталі дзясяткі чалавек. У сталіцы краіны Нью-Дэлі ў чэрвені быў устаноўлены новы тэмпературны рэкорд месяца — 48 градусаў Цэльсія ў цяні. За некалькі дзён да гэтага ў горадзе Чуру на паўночным захадзе Індыі слупок тэрмометра падняўся вышэй за 50 градусаў.



Водны крызіс ударыў па ўсёй краіне, аднак, як адзначае IMD, цяжэй за ўсё прыйшлося такім штатам, як Махараштра, Тамілнад, Карнатака, Талінгана і Андхра-Прадэш. Найбольшую трывогу экспертаў выклікае тэндэнцыя пачашчэння засушлівых перыядаў менавіта ў апошняе дзесяцігоддзе. Пры гэтым з-за глабальных змяненняў клімату сезоны дажджоў з кожным годам становяцца ўсё менш багатымі і працяглымі. Заклапочанасць спецыялістаў абгрунтаваная, адзначае The Times of India, паколькі 60 працэнтаў пасяўных плошчаў у Індыі не забяспечана штучным палівам.

Між тым аўстралійскія кліматолагі прыйшлі да высновы, што глабальнае пацяпленне прывядзе да доўгіх засух і недахопу пітной вады ў шэрагу рэгіёнаў свету. Яны папярэджваюць, што ўжо да сярэдзіны XXI стагоддзя некаторыя рэгіёны Еўропы, Азіі, і Афрыкі акажуцца непрыдатнымі для жыцця. Адной з першых з незваротнымі зменамі можа сутыкнуцца Індыя. Галоўная ўразлівасць гэтай краіны — велізарнае насельніцтва. Па прагнозах Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН, глабальнае пацяпленне скароціць колькасць ападкаў на поўначы і ў цэнтры краіны, з-за чаго знізіцца ўраджай. Пракарміць больш чым 1,3 мільярда чалавек за кошт павелічэння аб'ёмаў імпарту прадуктаў харчавання не атрымаецца. Праблемай можа стаць і характэрны для Індыі мусонны клімат, калі большая частка ападкаў прыходзіцца на лета і восень, а зімой і вясной доўжыцца засуха. Паколькі сітуацыя становіцца ўсё больш няўстойлівай, засухі могуць працягвацца даўжэй і змяняцца катастрафічнымі залевамі.

### КУДЫ БЕГЧЫ?

Яшчэ адна небяспечная асаблівасць Індыі — канцэнтрацыя насельніцтва ў вялікіх гарадах. Дэлі і Мумбаі разам са спадарожнікамі налічваюць больш за 20 мільёнаў жыхароў, Калькута — 15 мільёнаў, Бангалор, Чэнаі і Хайдарабад набліжаюцца да планкі ў 10 мільёнаў. Увявіце сітуацыю: у шасці найбуйнейшых гарадах краіны жыве 85 млн чалавек. Нават у спрыяльных умовах забяспечыць 10—20-мільённы мегаполіс вадой і ачысціць каналізацыйныя сцёкі вельмі складана. А ў Індыі з яе перыядычнымі засухамі і слабай інфраструктурай — тым больш. Вада, прыдатная для піцця і паліву палеткаў, стала праблемай для большай часткі краіны. На сённяшні дзень істотны недахоп гэтага жыццёва неабходнага рэсурсу ў 1,3-мільярднай Індыі адчуваюць каля 600 мільёнаў чалавек.

У Чэнаі, паведамляе Бі-бі-сі, сем'ям, якія маюць доступ да водаправода, прыходзілася абыходзіцца 30—40 літрамі вады. Гэтага з цяжкасцю хапае нават для таго, каб прыгатаваць ежу і памыць посуд. Горад перасякаюць тры ракі, але яны занадта мяккія і брудныя для таго, каб вырашыць праблему Бангалор, які нератварыўся ў апошнія дзесяцігоддзі ў буйны тэхналагічны цэнтр, перажывае бурны будаўнічы бум і не спраўляецца з нагрузкай на сістэмы каналізацыі і водазабеспячэння. Старая водаправодная сістэма горада мае патрэбу ў тэрміновай рэстаўрацыі. Вялікая частка вадаёмаў у Індыі пакутуе ад забруджвання, і Бангалор тут не выключэнне: у ходзе даследавання гарадскіх азёраў было выяўлена, што 85 працэнтаў з іх маюць ваду, прыдатную толькі для арашэння або прамысловай сістэмы ахаладжэння. Ні ў адным з азёраў нельга купацца ці піць з яго ваду. Адметна тое, што Чэнаі і Бангалор знаходзяцца ў зоне, якая традыцыйна лічылася спрыяльнай для жыцця.

На поўначы краіны, дзе працякае Ганг — адна з найбуйнейшых рэк свету, — сітуацыя не нашмат лепшая. Бескантрольнае будаўніцтва і развіццё прамысловасці прывяло да экстрэмальна высокага ўзроўню забруджвання воднай артэрыі і яе прытокаў. Рака Ямуна, у даліне якой размешчана некалькі хімічных камбінатаў, час ад часу пакрываецца слоем пены таўшчынёй да двух метраў. У найблізейшыя дзесяцігоддзі нават такая вада можа здацца падарункам. Ганг і яго паўночныя прыткі сілкуюцца ў асноўным за кошт ледавікоў, размешчаных у Гімалаях. З-за росту тэмператур яны растаюць ужо ў два разы хутчэй, чым 20 гадоў таму, а да 2100 года могуць знікнуць амаль цалкам. Такім чынам, вады ў Гангу будзе станавіцца ўсё менш. Гэта пагражае стабільнасці не толькі Індыі, але і ўсяго свету. У басейне ракі жыве амаль 700 мільёнаў чалавек. Яшчэ 250 мільёнаў жыве ў даліне Інда, дзе сітуацыя аналагічная. Не выключана, што значная частка гэтых людзей у будучыні захоча перасяліцца ў больш камфортныя ўмовы. Але бегчы ім няма куды. Побач — Бангладэш, дзе на кожны кіламетр прыходзіцца больш чым 1100 жыхароў, пустынныя Афганістан і кітайскі Тыбет.



### ТАТАЛЬНЫ ДЭФІЦЫТ

Нягледзячы на тое, што вада пакрывае каля 70 працэнтаў паверхні Зямлі, прэснай вады на планеце толькі тры працэнты. Агульны аб'ём — прыкладна 1,4 млрд куб. км. Большая частка запасаў засяроджана ў шматгадовых ільдах і снягах Антарктыды і Грэнландыі, а таксама ў глыбокіх ваданосных гарызонтах. Найбольш забяспечанай воднымі рэсурсамі з'яўляюцца Лацінская Амерыка, на долю якой прыпадае трэць сусветнага вадасцёку, і Азія. Затым ідуць краіны АЭСР — па сутнасці, найбольш развітыя (20 працэнтаў агульнага аб'ёму), дзяржавы Афрыкі на поўдзень ад Сахары і краіны былога Савецкага Саюза, на іх прыпадае па 10 працэнтаў. Найбольш абмежаваныя водныя рэсурсы краін Блізкага Усходу і Паўночнай Амерыкі (па адным працэнце). Найбольш буйнымі спажыўцамі вады з'яўляюцца Індыя, Кітай, ЗША, Пакістан, Японія, Тайланд, Інданезія, Бангладэш, Мексіка і Расія.

Больш за мільярд чалавек не маюць дастатковага доступу да вады, а яшчэ 2,7 мільярда адчуваюць яе недахоп па меншай меры на працягу аднаго месяца ў годзе. Згодна з адобраным ААН экспертным прагнозам, глабальны попыт на прэсную ваду ў 2030 годзе перавысіць прапанову на 40 працэнтаў з-за цэлага комплексу фактараў, у тым ліку змены клімату, дзейнасці чалавека і росту колькасці насельніцтва.

Таму наўрад ці можна лічыць нечаканасцю сітуацыю ў Індыі. Гэта толькі вяршыня айсберга. Буйныя гарады, схільныя да дэфіцыту вады, ёсць на ўсіх кантынентах. Па выніках спецыяльнага даследавання сітуацыі ў 500 найбуйнейшых гарадах свету, кожны чацвёрты з гэтых муніцыпалітэтаў знаходзіцца ў стане «воднага стрэсу». Па азначэнні ААН, гэта сітуацыя, калі запас вады складае менш за 1700 кубічных метраў на чалавека ў год. Летась першым сучасным буйным горадам свету, дзе запасы прэснай вады фактычна вычарпаліся, стаў паўднёваафрыканскі Кейптаўн.

Запасы прэснай пітной вады ўжо падыходзяць да канца. Згодна з даследаваннямі, да 2025 года больш за палову дзяржаў планеты адчуюць сур'ёзны недахоп вады, а да сярэдзіны XXI стагоддзя ўжо 3/4 насельніцтва свету сутыкнецца з дэфіцытам. З найбольшай верагоднасцю першымі застануцца без вады Афрыка, Паўднёвая Азія, Блізкі Усход і Паўночны Кітай. Па прагнозах, толькі ў Афрыцы ўжо налета з-за змен клімату ў такой сітуацыі апынецца ад 75 да 250 мільёнаў чалавек, а востры недахоп вады ў пустынных і паўпустынных рэгіёнах выкліча імклівую міграцыю насельніцтва. Чакаецца, што гэта закране ад 24 да 700 мільёнаў чалавек. Недахоп прэснай вады апошнім часам адчуваюць і развітыя краіны: не так даўно моцныя засухі ў ЗША прывялі да дэфіцыту вады на вялікіх тэрыторыях Паўднёвага Захаду і ў гарадах на поўначы штата Джорджыя.

### АЙСБЕРГ НА БУКСІРЫ

У аўтарытэтным навуковым часопісе Nature Sustainability быў апублікаваны артыкул пра тое, што для скарачэння аб'ёмаў выкарыстання прэснай вады неабходна змяняць і вытворчасць, і сістэму спажывання прадуктаў харчавання. Эксперты з Аб'яднанага даследчага цэнтра Еўракамісіі пад кіраўніцтвам Дэйві Ванхэма заявілі, што пераход на збалансаваную мясную дыету зможа скараціць расход найважнейшага рэсурсу на 11—35 працэнтаў у залежнасці ад раёна. А пераход на рыбную або вегетарыянскую дыету захаваў бы ад 33 да 55 працэнтаў прэснай вады, якая цяпер затрачваецца на вытворчасць мясапрадуктаў. Навукоўцы з універсітэта Твэнтэ (Нідэрланды) высветлілі, што сама вадаёмістая вытворчасць ялавічыны: для вырошчвання аднаго кілаграма гэтага мяса неабходна 15 тысяч літраў вады. Для параўнання: для вытворчасці кілаграма свініны трэба 6 тысяч літраў вады, курацінны — 4,3 тысячы літраў.

Эфектыўныя шляхі барацьбы з водным крызісам ажыццяўляюцца краінамі Персідскага заліва. Яны сталі магчымыя з сярэдзіны XX стагоддзя дзякуючы нафтаваму буму. Зараз Саудаўская Аравія і ААЭ вылучаюцца самымі значнымі аб'ёмамі апраснення вады не толькі ў рэгіёне, але і ў свеце. Акрамя гэтага, усе краіны Заліва маюць развітыя ачышчальныя сістэмы для ўтылізацыі і паўторнага выкарыстання забруджаных водаў.

Сярод спосабаў наталіць смагу ёсць даволі экзатычныя. Напрыклад, днямі з'явілася інфармацыя аб тым, што велізарны айсберг з Антарктыды даставяць у Арабскія Эміраты. Ледзяную глыбу плануюць зрабіць турыстычнай «цікавінкай» ААЭ. І задаволіць недахоп пітной вады. Па падліках, аднаго айсберга будзе дастаткова, каб забяспечыць усё насельніцтва Эміратаў вадой на пяць гадоў.

**Захар БУРАК.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ** | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703<br>**Продавец:** ОАО «Гомельский винодельческий завод», 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10.<br>**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б | | |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** | |
| **Имущество, реализуемое одним лотом, в следующем составе: адрес: Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, 72А** | | |
| Наименование (назначение) | Площадь | Инвентарный № |
| Покрытие площадью 2573,9 кв. м (сооружение неустановленного назначения).<br>Составные части и принадлежности: асфальтовое покрытие площадью 2573,9 кв. м | 2573.9 кв. м | 324/С-12315 |
| Навес (сооружение специализированное складов, хранилищ) | 1636,2 кв. м | 324/С-10708 |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 66 360,00 бел. руб. (шаг аукциона 3 318,00 бел. руб.)** | | |
| **Сведения о земельном участке**: кадастровый номер: 325650100001002127, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания навеса, общ. пл. 0,9534 га | | |
| **Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Контактное лицо по осмотру: тел. +37544 587-97-44 (Юрченко Николай Петрович) | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| Срок подписания договора купли-продажи | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | | |
| Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов | | |
| **Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить Организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение, а также возместить Продавцу затраты по публикации извещений в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов | | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | | |
| **Дата, время и место проведения электронных торгов: 15.08.2019** в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)** | | |
| Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация):<br>**13.08.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)** | | |
| **Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | | |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении аукциона** | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |
| **Предмет аукциона**<br>**Торговое помещение,** общ. пл. **214,2 кв.м.**, инв. № **130/D-4369**, по адресу: **Брестская обл., г. Пинск, ул. Советская, д. 2.** Начальная цена с НДС 20 % – **204 000,00 бел. руб.**<br>**Обременение: частичная аренда.** Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок заключения договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество,** установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной | |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **15** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи | |
